Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 259 (5102)
СНЕЖНЯ
2
НЯДЗЕЛЯ
1934 г.
Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЕННЯ Ў НУМАРЫ:

АД ЗДРАДНІЦКАЙ РУКІ ЗАГІНУЎ САКРАТАР ЦК І ЛЕНІНГРАДСКАГА АБКОМА ВКП(б) ТАВ. С. М. КІРАЎ.

АБ АДМЕНЕ КАРТАЧНАЙ СІСТЭМЫ ПА ХЛЕБУ — ДАКЛАД ТАВ. В. М. МОЛАТАВА НА ПЛЕНУМЕ ЦК ВКП(б).

ВОДГУКІ РАБОЧЫХ І КАЛГАСНІКАЎ БССР НА ПАСТАНОВЫ ЛІСТАПАДАЎСКАГА ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б).

НА ДАПАМОГУ ІСПАНСКІМ РЭВОЛЮЦЫЯНЕРАМ.

ПРЫЕЗД ФРАНЦУЗСКАЙ РАБОЧАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ Ў МЕНСК.

ПАШЫРАЕЦЦА СЕТКА ХЛЕБНЫХ КРАМ.

ЗА РУБЯЖОМ.

ГЕРМАНСКІЯ ВОДГУКІ НА РАШЭННЕ ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б)

БАЯВАЯ РАШУЧАСЦЬ ПРОЛЕТАРЫЯЎ АСТУРЫІ.

РОСТ БЕСПРАЦОЎЯ Ў США.

МАШЭННІЦКІЯ МАХІНАЦЫІ БЕЛАБАНДЫТА БАЛАХОВІЧА.

АД ЗДРАДНІЦКАЙ РУКІ ЗАГІНУЎ САКРАТАР ЦК І ЛЕНІНГРАДСКАГА КАМІТЭТА ВКП(б)

АД ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА ЎСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (БОЛЬШЭВІКОЎ)

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ ВКП(БОЛЬШЭВІКОЎ) З ВЯЛІКІМ ЖАЛЕМ ПАВЕДАМЛЯЕ ПАРТЫЮ, РАБОЧЫ КЛАС І ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ САЮЗА ССР І ПРАЦОЎНЫХ УСЯГО СВЕТУ, ШТО 1 СНЕЖНЯ Ў ЛЕНІНГРАДЗЕ АД ЗДРАДНІЦКАЙ РУКІ ВОРАГА РАБОЧАГА КЛАСА ЗАГІНУЎ ВЫДАТНЫ ДЗЕЯЧ НАШАЙ ПАРТЫІ, ПАЛКІ, БЯССТРАШНЫ РЭВОЛЮЦЫЯНЕР, ЛЮБІМЫ КІРАЎНІК БОЛЬШЭВІКОЎ І ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ ЛЕНІНГРАДА, САКРАТАР ЦЭНТРАЛЬНАГА І ЛЕНІНГРАДСКАГА КАМІТЭТАЎ ВКП(БОЛЬШЭВІКОЎ), ЧЛЕН ПАЛІТБЮРО ЦК ВКП(б) ТАВАРЫШ СЕРГЕЙ МІРОНАВІЧ КІРАЎ.

СТРАТА ТАВАРЫША КІРАВА, ЛЮБІМАГА УСЕЙ ПАРТЫЯЙ І УСІМ РАБОЧЫМ КЛАСАМ СССР, КРЫСТАЛЬНА ЧЫСТАГА І НЕПАХІСНАГА СТОЙКАГА ПАРТЫЙЦА—БОЛЬШЭВІКА - ЛЕНІНЦА, АДДАЎШАГА ЎСЁ СВАЁ ЯРКАЕ, СЛАЎНАЕ ЖЫЦЦЁ СПРАВЕ РАБОЧАГА КЛАСА, СПРАВЕ КОМУНІЗМА, З'ЯЎЛЯЕЦЦА САМАЙ ЦЯЖКАЙ СТРАТАЙ ДЛЯ УСЕЙ ПАРТЫІ І КРАІНЫ СОВЕТАЎ ЗА АПОШНІЯ ГАДЫ.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ ВЕРЫЦЬ, ШТО ПАМЯЦЬ АБ ТАВАРЫШУ КІРАВЕ, СВЕТЛЫ ПРЫКЛАД ЯГО БЯССТРАШНАЙ, НЯСТОМНАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ПРОЛЕТАРСКУЮ РЭВОЛЮЦЫЮ, ЗА БУДАЎНІЦТВА СОЦЫЯЛІЗМА Ў СССР БУДУЦЬ НАТХНЯЦЬ МІЛЬЁНЫ ПРОЛЕТАРЫЯЎ І ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ НА ГАЛЕЙШУЮ БАРАЦЬБУ ЗА ТАРЖЭСТВО СОЦЫЯЛІЗМА, ЗА КАНЧАТКОВАЕ ВЫКАРАНЕННЕ ЎСІХ ВОРАГАЎ РАБОЧАГА КЛАСА.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (БОЛЬШЭВІКОЎ).

Тав. С. М. КІРАЎ

(БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА)

Член палітбюро Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), сакратар Цэнтральнага і Ленінградскага камітэтаў партыі, стары большэвік, член партыі з 1904 года, **Сергей Міронавіч Кіраў** (партыйная кличка Сергей, Серж, Кострыкаў) радзіўся ў 1886 г. у г. Уржуме, Вяцкай губ. Ва Ўржуме Кіраў скончыў пачатковую школу, затым гарадскую школу. Вучыўся добра і пасля сканчэння змог паступіць у казанскую механіка-тэхнічную школу. Яшчэ ва Ўржуме, куды царскі ўрад ссылаў рэволюцыянераў, Сергей Міронавіч пазнаёміўся з палітычнымі ссыльнымі, якія сталі яго сапраўднымі першымі настаўнікамі. З імі тав. Кіраў падтрымліваў сувязі, вучачыся ў Казані.

Рэволюцыйную дзейнасць тав. Кіраў пачаў у Томску, куды накіраваўся з роднага горада для таго, каб падрыхтавацца к паступленню ў тэхналагічны інстытут. Вучачыся на агульна-асветных курсах, звязаўся з томскай социял-дэмакратычнай арганізацыяй. У студзені 1905 года С. М. Кіраў прыняў удзел у арганізацыі ўзброенай дэманстрацыі. 2 лютага 1905 года быў арыштован на нелегальным партыйным сходзе разам з 40 таварышамі. Прасядзеў у «адміністратыўным парадку» некалькі месяцаў. У хуткім часе пасля тэтага арышта тав. Кіраў становіцца прафесіяльным рэволюцыянерам, аддае ўсе свае сілы і выдатныя здольнасці партыйнай рабоце.

З першых шагоў сваёй рэволюцыйнай дзейнасці тав. Кіраў далучыўся да невялікай тады групы томскіх большэвікоў. Затым уводзіцца ў склад томскага камітэта РСДРП і загадвае нелегальнай партыйнай друкарняй. У рэволюцыю 1905 года на ст. Тайга праводзіў забастоўку чыгуначных рабочых, прайшоўшую з вялікім поспехам.

У самым пачатку 1906 года тав. Кіраў быў камандыраван партыйнай арганізацыяй у Маскву і Пецербург для набыцця добрай друкарскай машыны, але ў дзень ад'езду быў арыштован. Прасядзеўшы ў томскай турме каля года, быў вызвалены пад залог да суда, але затым зноў арыштован па абвінавачанню ў стварэнні нелегальнай друкарні і прыгавораны судом да 3 год зняволення ў крэпасці.

Пасля адбыцця зняволення тав. Кіраў пераехаў у Іркупк, але ў хуткім часе яму прышлося ўцякаць на Каўказ—ва Владзікаўказ. Арганізацыйны тут не было. Былі толькі паасобныя таварышы. Тут тав. Кіраў у якасці нелегальнага работніка пражыў некалькі год. Пачалася вайна. У 1915 годзе—4-ы арышт. Па этапу адпраўлен у Томск і Омск. Зноў год турмы. Прадстаяла высылка ў Нарымскі край, але перашкодзіла лютаўская рэволюцыя.

Тав. Кіраў прымае ў ёй самы непасрэдны ўдзел у якасці члена владзікаўказскага камітэта социял-дэмакратычнай арганізацыі. Ва Владзікаўказе ён працуе ўвесь 1917 год і, калі над Каўказам запылала полымя Окцября тав. Кіраў—адзін з арганізатараў совецкай улады і кіраўнікоў узброенай барацьбы супроць белаказачых банд. Яго камандзіруе большэвіцкая арганізацыя ў Маскву за зброяй і сваражэннем для нараджаючагася чырвонага каўказскага фронта.

З вялікім транспартам ваенных прыпасаў варочаўся тав. Кіраў у 1918 годзе на Каўказ праз Царыцын. Але прабрацца ўжо было нельга. Залатапагонныя банды паспелі адрэзаць разрозненыя партызанскія атрады каўказскай Чырвонай арміі. Партыя ўжо ведае тав. Кірава—загартаванага і стойкага бойца, яго светлы розум, яго спакойную рашучасць і ахвярную аддапасць пролетарскай рэволюцыі. Яму даручаюць адказнейшы ўчастак барацьбы з контрэволюцыяй—абарону Астрахані. Кіраў ушчэнце найярчэйшую старонку ў гісторыю грамадзянскай вайны. Тут, калі нізоўя Волгі, тав. Кіраў кіруе збіраннем і прывядзеннем у парадак XI арміі. Астрахань асталася ў руках совецтаў, бо ў рэволюцыйным ваенным совеце XI арміі, абараняўшай волжскую совецкую цвярдыню, кіпела невычарпальная энергія Сергея Міронавіча.

Разам з XI арміяй, на чале яе, тав. Кіраў удзельнічае ў разгроме Дзенікіна, у аднаўленні совецкай улады на Паўночным Каўказе і ў Баку.

Пачынаецца паласа напружаных адносін паміж совецкім Азербайджанам і меншавіцкай Грузіяй. Совецкі ўрад назначае тав. Кірава паўнамоцным прадстаўніком РСФСР у Тыфлісе. Пры некаторы час Сергей Міронавіч атрымлівае новае адказнае даручэнне—удзельнічаць у якасці члена совецкай дэлегацыі ў перагаворах з Польшчай аб міры.

Затым—зноў партыйная работа на Паўночным Каўказе, потым у Азербайджане. Тут тав. Кіраў працуе ў якасці сакратара Цэнтральнага Камітэта азербайджанскай комуністычнай партыі, члена закаўказскага Краявога Камітэта ВКП(б). Тав. Кіраву—выдатнаму партыйнаму кіраўніку належыць нямала заслуг у стварэнні і ўмацаванні совецкай улады на Паўночным Каўказе і ў Закаўказзі. Бакінскі пролетарыят цаніў і любіў свайго кіраўніка, друга тав. Кірава.

Партыя добра ведала тав. Кірава. На X партыйным з'ездзе ён выбіраецца кандыдатам у члены Цэнтральнага Камітэта, а на XI з'ездзе—членам Цэнтральнага Камітэта партыі.

Страстны рэволюцыянер, непрымірымы вораг малейшых адхіленняў ад большэвізма, ад ленінізма, тав. Кіраў быў выдатным бойцом за партыю, за Цэнтральны Камітэт, за перамогу социялізма ў нашай краіне. Кіраў быў адным з першых там, дзе партыя вяла барацьбу пад кіраўніцтвам тав. Сталіна з контрэволюцыйным троцкізмам, з зіноўеўскай апазіцыяй, правымі апартыстамі. Кіраў—ближэйшы саратнік, вучань і друг вялікага Сталіна.

У 1926 годзе, пасля разгрому зіноўеўскай апазіцыі, тав. Кіраў—сакратар Ленінградскага губкома ВКП(б) і паўночна-заходняга бюро Цэнтральнага камітэта ВКП(б) і кандыдат у члены палітбюро ЦК ВКП(б).

З 1928 года—сакратар ленінградскага абласнога камітэта ВКП(б). З 1930 года — член палітбюро ЦК ВКП(б), а з 1934 года — член палітбюро, сакратар ЦК ВКП(б) і сакратар ленінградскага абласнога і гарадскога камітэтаў партыі.

Тав. Кіраў — член прэзідыума Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР многіх скліканняў.

Тав. Кіраў быў любімым кіраўніком ленінградскіх рабочых сярод якіх ён карыстаўся велізарным аўтарытэтам. Гэта быў сапраўдны трыбун, усё жыццё якога найярчэйшая старонка ў летапісі гераічных год пролетарскай рэволюцыі і яе велізарных заваёў. Тав. Кіраў змагаўся 30 год за справу рабочага класа, як сапраўдны большэвік і такім смерць засцігла яго на баявым пасту.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюза ССР з глыбокім жалем паведамляе рабочых і работніц, калгаснікаў і калгасніц і ўсіх працоўных Саюза ССР, што 1 снежня ў 16 гадзін 30 мінут у горадзе Ленінградзе ад рукі забойцы ворага совецкай улады загінуў член прэзідыума ЦВК Саюза ССР тав. КІРАЎ СЕРГЕЙ МІРОНАВІЧ.

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР.

Ад Совета Народных Камісараў СССР

Совет Народных Камісараў Саюза ССР з глыбокім жалем паведамляе рабочых, сялян і ўсіх працоўных Саюза ССР, што 1 снежня ў Ленінградзе ад здрадніцкай кулі паласланага ворагамі рабочых і сялян забойцы загінуў палкі і самаадданы змагар за справу рабочага класа, за справу комунізма, член палітбюро і сакратар Цэнтральнага і Ленінградскага камітэтаў ВКП(большэвікоў), член прэзідыума ЦВК Саюза ССР **Сергей Міронавіч Кіраў.**

Совет Народных Камісараў цвёрда ўпэўнены у тым, што жыццё слаўнага большэвіка, аднаго з лепшых кіраўнікоў нашай партыі і краіны таварыша Кірава будзе для ўсіх пролетарскіх рэволюцыянераў прыкладам барацьбы з ворагамі працоўных за справу пролетарскай рэволюцыі, за перамогу комунізма.

СОВЕТ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР.

Ленінградскі абласны і гарадскі камітэты ВКП(б) з глыбокім жалем паведамляюць рабочых, работніц, калгаснікаў і ўсіх працоўных горада Леніна і Ленінградскай вобласці аб смерці нашага любімага правадыра, настаўніка і друга-сакратара ЦК ВКП(б) і Ленінградскага камітэта ВКП(б)

СЕРГЕЯ МІРОНАВІЧА КІРАВА.

Подлай рукою ворага рабочага класа забіт мужны і незгібаемы лепінец, аддаўшы ўсё сваё жыццё справе рабочага класа. З нашых баявых радоў вырваў віднейшы і любімы дзеяч нашай слаўнай большэвіцкай партыі.

Разам з усёй партыяй і працоўнымі ўсяго Саюза ленінградскія большэвікі, рабочыя і работніцы горада Ленінграда схіляюць баявыя сцягі над пробам тав. Кірава.

Вялікі прыклад беззаветнай барацьбы тав. Кірава за справу социялізма, светлая памяць аб ім яшчэ цясней згуртуе рады ленінградскіх большэвікоў, рабочых і работніц і ўсіх працоўных горада Леніна і Ленінградскай вобласці вакол непераможнага сцяга Леніна-Сталіна.

ЛЕНІНГРАДСКІ АБЛАСНЫ І ГАРАДСКІ КАМІТЭТЫ ВКП(б).

Народны камісарыят абароны Саюза ССР з найглыбейшым жалем паведамляе чырвонаармейцаў, камандзіраў і палітработнікаў рабоча-сялянскай Чырвонай арміі аб смерці сакратара Цэнтральнага Камітэта і Ленінградскага абласнога камітэта ВКП(б), старэйшага большэвіка, аднаго з кіраўнікоў нашай партыі, актыўнейшага арганізатара перамог Чырвонай арміі на фронтах грамадзянскай вайны, **Сергея Міронавіча КІРАВА,** загінуўшага ад здрадзецкай рукі ворага рабочых і сялян.

Чырвоная армія назаўсюды захавае памяць аб таварышу Кіраве, сталёвым большэвіку, доблесным сыну байцу і блізкім другу. Яго слаўнае жыццё, яго нястомная барацьба супроць ворагаў пролетарскай рэволюцыі заўсёды будзе натхняць рабоча-сялянскую Чырвоную армію на беззаветную абарону нашай радзімы.

ПАМЯЦІ КІРАЎНІКА ЛЕНІНГРАДСКІХ БОЛЬШЭВІКОЎ

ЛЕНІНГРАД, 2 снежня. (БЕЛТА). Учора неадкладна пасля атрымання сумнай весткі аб гібелі ад варожай кулі тав. С. М. КІРАВА на ленінградскіх заводах і фабрыках адбыліся мітынгі.

ЗАВОД «ЭЛЕКТРАСІЛА»

Подлая рука ворага з-за вугла — заўплюць у сваёй рэзалюцыі рабочыя завода «Электрасіла» — пранзіла кулаю кіраўніка ленінградскіх пролетарыяў, сакратара ЦК і любімага кіраўніка ленінградскіх большэвікоў — Сергея Міронавіча Кірава.

Няма такога рабочага, у якога гэта страшная вестка не выклікала-б пачуццё гнева і абурэння.

Няма такой рабочай сям'і ў горадзе Леніна, дзе-б гэту вестку не прынялі, як самую цяжкую і самую горкую.

У адказ на гэта подлае забойства мы адкажам яшчэ большым згуртаваннем вакол партыі, вакол яе ленінскага Цэнтральнага Камітэта, вакол любімага і вялікага Сталіна ў барацьбе за выкананне плана 2-й пяцігодкі, за будаўніцтва социялізма, за знішчэнне капіталістычных класаў.

«КРАСНЫЙ ТРЕУГОЛЬНИК»

На заводах камбіната «Красный треугольник» адбыліся пятучыя мітынгі, на якіх прысутнічала звыш 10 тыс. чалавек.

— З вялікім жалем даведаліся мы аб подлым забойстве агентам класавага ворага кіраўніка ленінградскіх пролетарыяў, нашага роднага, любімага СЕРГЕЯ МІРОНАВІЧА КІРАВА — заяўляюць рабочыя «Краснага треугольника».

Пролетарыят страціў аднаго з баявых арганізатараў ленінскай партыі, яркага трыбуна пролетарскай рэволюцыі, вернага і стойкага саратніка вялікага Сталіна.

З намі няма больш тав. Кірава, але памяць аб ім, аб нашым любімым кіраўніку, яшчэ больш згуртуе нас вакол ленінскай партыі для барацьбы за поўную пабудову социялізма.

Нахай ведаюць і памятаюць класавыя ворагі, што нікому не ўдасца ўнесці замяшанне ў рады нашай вялікай партыі, партыі Леніна-Сталіна. Мы будзем цвёрда і паслядоўна змагацца за тую справу, за якую змагаўся і загінуў наш дарагі Сергей Міронавіч. Мы заклікаем усіх рабочых гор. Леніна павысіць сваю рэволюцыйную класавую пільнасць.

«КРАСНЫЙ ПУТИЛОВЕЦ»

Да ўсіх комуністаў, да ўсіх рабочых і работніц горада Леніна, да ўсіх працоўных Совецкага Саюза звяртаюцца ў сваёй рэзалюцыі рабочыя «Краснаго путиловца».

Таварышы і браты! Пролетарыяты горада Леніна, працоўныя нашай радзімы панеслі цяжкую, жорсткую ўтрату. 1 снежня ад рукі подлага наёмнага забойцы паў кіраўнік пролетарскага Ленінграда, наш горача любімы Сергей Міронавіч Кіраў. Куля класавага ворага сразіла і вырвала з нашых радоў цвёрдаманкенага ленінца, друга і саратніка вялікага Сталіна, палкага трыбуна, мужнага большэвіка.

Пролетарыі горада Леніна страцілі свайго кіраўніка, самаахвярнага, бязмежна адданага справе Леніна, справе социялізма. Ён быў лепшым нашым другам, таварышам, настаўнікам.

У заключэнне краснапуцілаўцы заяўляюць: «ніхто не спыніць нас у нашым неўхільным победоносным руху да социялізма. Мы абнажаем галовы, мы кланяемся, што справа, за якую змагаўся і загінуў тав. Кіраў будзе даведзена да пераможнага канца.

Вышэй сцягі вялікай пролетарскай дыктатуры. Цясней рады вакол нашай партыі, вакол нашага Цэнтральнага Камітэта на чале з вялікім правадыром працоўнага чалавецтва тав. Сталіным».

Нашу партыю пасцігла вялікае нашчасце. 1 снежня ад рукі злачынцы забойцы, паслапнага класавымі ворагамі, загінуў таварыш КІРАЎ. Не толькі для нас, яго блізкіх сяброў і таварышоў, але і для ўсіх ведаўных яго па рэволюцыйнай рабоце, ведаўшых яго як байца, таварыша і друга, смерць Кірава з'яўляецца нічым неўзнаградзімай утратай. Ад рукі ворага загінуў чалавек, які ўсё сваё яркае жыццё аддаў справе рабочага класа, справе комунізма, справе вызвалення чалавецтва.

Тав. Кіраў прадстаўляў з сябе ўзор большэвіка, не ведаўшага страху і труднасцей у дасягненні вялікай мэты, пастаўленай партыяй. Яго прамота, жалезная стойкасць, яго здзіўляючыя якасці натхнёпага трыбуна рэволюцыі спалучаліся ў ім з той сардэчнасцю і мяккасцю ў асабістых таварыскіх і сяброўскіх адносінах, з той прамалінейнай і скромнасцю, якія ўласцівы сапраўднаму ленінцу.

Таварыш Кіраў працаваў у розных частках Саюза ССР і ў часы падполля і пасля Окцябрскай рэволюцыі — у Томску і Астрахані ва Владзікаўказе і Баку—і ўсюды ён высока трымаў сцяг партыі і заваёўваў для справы партыі мільёны працоўных сваёй нястомнай, энергічнай і пладатворнай работай рэволюцыянера.

Апошнія 9 год таварыш Кіраў кіраваў арганізацыяй нашай партыі ў горадзе Леніна і Ленінградскай вобласці. У кароткім сумным пісьме няма магчымасці даць ацэнку яго дзейнасці сярод працоўных Ленінграда. Трудна было-б знайсці ў нашай партыі больш падыходзячага кіраўніка для рабочага класа Ленінграда, так умела спаяўшага ўсіх партыйцаў і ўвесь рабочы клас вакол партыі. Ён стварыў ва ўсёй ленінградскай арганізацыі атмасферу большэвіцкай арганізаванасці, дысцыпліны, любві і аддапасці справе рэволюцыі, якімі адзначаўся сам таварыш Кіраў.

Ты быў блізак усім нам, таварыш Кіраў, як верны друг, любімы таварыш, надзейны саратнік. Да апошніх дзён свайго жыцця і барацьбы мы будзем успамінаць цябе, дарагі друг, і будзем адчуваць горыч нашай страты. Ты быў заўсёды з намі ў гады цяжкіх баёў за таржэство социялізма ў нашай краіне. Ты быў з намі заўсёды ў гады хістанняў і труднасцей унутры нашай партыі, перажыў з намі ўсе труднасці апошніх год, і мы страцілі цябе ў момант, калі наша краіна дасягнула вялікіх перамог. Ва ўсёй гэтай барацьбе, ва ўсіх нашых дасягненнях многа тваёй долі, многа тваёй энергіі, сілы і палкай любві к справе комунізма.

Прашчай, наш дарагі друг і таварыш Сергей!

І. СТАЛІН,
С. ОРДЖАНІКІДЗЕ,
В. МОЛАТАЎ,
М. КАЛІНІН,
К. ВАРАШЫЛАЎ,
Л. КАГАНОВІЧ,
А. МІКАЯН,
А. АНДРЖЕЎ,
В. ЧУБАР,
А. ЖДАНАЎ,
В. КУЙБЫШЭЎ,
Я. РУДЗУТАК,
С. КАСІОР,
П. ПОСТЫШЭЎ,
Г. ПЕТРОЎСКІ,
А. ЕНУКІДЗЕ,
М. ШКІРАТАЎ,
ЕМ. ЯРАСЛАЎСКІ,
Н. ЕЖОЎ.

УРАДАВАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

1 СНЕЖНЯ Ў 16 ГАДЗІН 30 МІНУТ У ГОР. ЛЕНІНГРАДЗЕ Ў ВУДЫНКУ ЛЕНІНГРАДСКАГА СОВЕТА (БЫЎШЫ СМОЛЬНЫ) АД РУКІ ЗАБОЙЦЫ, ПАДАСЛАНАГА ВОРАГАМІ РАБОЧАГА КЛАСА, ЗАГІНУЎ САКРАТАР ЦЭНТРАЛЬНАГА І ЛЕНІНГРАДСКАГА КАМІТЭТАЎ ВКП(большэвікоў) І ЧЛЕН ПРЭЗ'ДЫУМА ЦВК СССР ТАВАРЫШ СЕРГЕЙ МІРОНАВІЧ КІРАЎ. СТРАЛЯЎШЫ ЗАТРЫМАН. АСОБА ЯГО ВЫСВЯТЛЯЕЦЦА.

Маскоўскі абласны і гарадскі камітэты ВКП(б) з глыбокім жалем паведамляюць маскоўскіх большэвікоў, пролетарыяў і працоўных, што ад рукі забойцы, падасланага ворагамі рабочага класа, загінуў любімы кіраўнік працоўных і большэвікоў Ленінграда, выдатны кіраўнік нашай партыі, верны саратнік тав. Сталіна ў барацьбе за ленінізм, за справу рабочага класа, за таржэство комунізма—тав. КІРАЎ СЕРГЕЙ МІРОНАВІЧ.

Маскоўскі абласны і гарадскі камітэты партыі ад імя маскоўскіх большэвікоў, рабочых і працоўных, сумуючы разам з усёй партыяй, з усёй краінай—у гэту гадзіну цяжкай утраты заяўляюць, што яшчэ мацней згуртуюцца вакол ленінскага Цэнтральнага Камітэта для далейшай барацьбы з ворагамі рабочага класа, за перамогу социялізма ва ўсім свеце!

МАСКОЎСКІ АБЛАСНЫ І ГАРАДСКІ КАМІТЭТЫ ВКП(б).

ЦК ВКП(б)—тав. СТАЛІНУ

ЦК КП(б)Б разам з усёй КП(б)Б, рабочымі, калгаснікамі і ўсімі працоўнымі Совецкай Беларусі, разам з ЦК ВКП(б), разам з усёй партыяй, рабочым класам і працоўнымі краіны Совецтаў глыбока скарбіць аб найцяжэйшай утраце.

Клянемся ля труны бяссстрашнага змагара за справу пролетарскай рэволюцыі, за справу комунізма—тав. С. М. Кірава яшчэ мацней згуртаваць працоўных Беларусі для нястомнай бязлітаснай барацьбы з ворагамі рабочага класа, яшчэ цясней самкнуць свае рады вакол ленінскай партыі і яе правадыра таварыша Сталіна.

ЦК КП(б) Беларусі.

ЛЕНІНГРАД, АБКОМ ПАРТЫІ, тав. ЧУДАВУ

Глыбока патрасяны гібеллю любімага кіраўніка большэвікоў Ленінграда. Разам з комуністамі і пролетарыямі горада Леніна скарбім аб гібелі бяссстрашнага барацьбіта за справу комунізма, любімага ўсёй партыяй, рабочым класам і працоўнымі краіны Совецтаў, аднаго з лепшых прадстаўнікоў старой большэвіцкай гвардыі, аднаго з лепшых саратнікаў таварыша Сталіна—тав. С. М. Кірава, паўшага ад рукі ворагаў рабочага класа.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў) БЕЛАРУСІ.

Камісія партыйнага кантроля пры ЦК ВКП(б) і Цэнтральная Камісія ВКП(б) па чыстцы глыбока скарбяць аб смерці любімага таварыша Сергея Міронавіча Кірава — члена палітбюро ЦК ВКП(б) і члена Цэнтральнай Камісіі ВКП(б) па чыстцы, загінуўшага на баявым рэволюцыйным пасту ад рукі забойцы, падасланага класавым ворагам.

Усерасійскі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў РСФСР з глыбокім жалем паведамляюць рабочых, калгаснікаў і ўсіх працоўных РСФСР аб смерці члена ВЦВК—сакратара Ленінградскага абласнога камітэта ВКП(б),

тав. СЕРГЕЯ МІРОНАВІЧА КІРАВА,

загінуўшага ад рукі ворага совецкай улады.

Усерасійскі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў РСФСР выказваюць упэўненасць, што ў адказ на ўдар класавага ворага рабочыя, калгаснікі і ўсе працоўныя нашай краіны яшчэ мацней згуртуюцца вакол комуністычнай партыі і совецкай улады за перамогу комунізма.

ПРЭЗІДЫУМ УСЕРАСІЙСКАГА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА.
СОВЕТ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ РСФСР.

ПАВЕДАМЛЕННЕ АД КАМІСІІ ПА ПАХАВАННЮ тав. КІРАВА

ПАХАВАННЕ ТАВАРЫША КІРАВА С. М. АДБУДЗЕЦЦА 6 СНЕЖНЯ Ў 15 ГАДЗІН У ГОРАДЗЕ МАСКВЕ НА ЧЫРВОНАЙ ПЛОШЧЫ.

АБ ДНІ ПРЫБЫЦЦЯ Ў МАСКВУ ЦЕЛА ТАВАРЫША КІРАВА БУДЗЕ ПАВЕДАМЛЕНА ДАДАТКОВА.

КАМІСІЯ.

ЛЕНІНСКІ КОМСАМОЛ разам з усёй партыяй, з усім рабочым класам, з усімі працоўнымі нашай краіны глыбока сумуе аб незваротнай утраце непахіснага, палкага рэволюцыянера, любімейшага кіраўніка — большэвікоў, пролетарыяў горада Леніна — СЕРГЕЯ МІРОНАВІЧА КІРАВА.

Светлы вобраз саратніка вялікага Сталіна, выдатнага дзеяча большэвіцкай партыі — Сергея Міронавіча Кірава будзе жыць у сэрцах мільёнаў працоўнай моладзі, натхняючы яе на новыя подвігі пад сцягам партыі Леніна-Сталіна.

Цэнтральны Камітэт ВЛКСМ у гэту сумную гадзіну заклікае ўсю працоўную моладзь яшчэ цясней згуртавацца вакол магутнай большэвіцкай партыі, павышаючы сваю пільнасць і боездольнасць у барацьбе за канчатковае выкараненне ўсіх ворагаў рабочага класа, за поўную перамогу социялізма.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УСЕСАЮЗНАГА ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗА МОЛАДЗІ.

1 XII-34 г.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Для арганізацыі пахавання таварыша Кірава Сергея Міронавіча створана камісія ў складзе:

Енукідзе А. С.
Чудава М. С.
Алексеева П.
Гамарніка Я. Б.
Хрушчова Н. С.
Булганіна Н. А.

АБ АДМЕНЕ КАРТАЧНАЙ СІСТЭМЫ ПА ХЛЕБУ

(Даклад тав. В. М. МОЛАТАВА на пленуме ЦК ВКП(б) 25 лістапада г. г.)

I. АДМЕНА КАРТАЧНАЙ СІСТЭМЫ ПА ХЛЕБУ — ПАКАЗАЛЬНІК НАШЫХ ПОСПЕХАЎ

Таварышы! Не выпадкова, што пытанне аб адмене картачнай сістэмы па хлебу пастаўлена іменна ў даны момант. Гэта пытанне наспела.

Рашэнне партыі аб увядзенні рацыянавання (картачнай сістэмы) у снабжэнні адносіцца к канцу 1928 года. З пачатку 1929 года картачная сістэма па хлебу, а потым і па некаторых іншых прадуктах, стала ўводзіцца ў Маскве, Ленінградзе і ва ўсёй спажываючай паласе, а праз некаторы час і па ўсяму Совецкаму Саюзу. Такім чынам, існаванне картачнай сістэмы па хлебу ахапляе апошнія шэсць год.

Мы ўводзілі картачную сістэму па хлебу тады, калі калгасаў і соўгасаў у нас было мала, калі ў вёсцы пераважала дробная аднаасобная сялянская гаспадарка з яе мізэрнай тэхнікай і нізкай ураджайнасцю. Празмернае адставанне тагочаснай раздробленай сялянскай гаспадаркі ад росту прамысловасці, ад усяго соцыялістычнага будаўніцтва вымусіла нас увесці карчатную сістэму снабжэння, не гледзячы на ўсе яе нязручнасці.

К цяперашняму моманту мы дабіліся карэннай змены ў сельскай гаспадарцы. Цяпер у вёсцы пануе калгасны лад, узброены многімі тысячамі трактароў, аўтамашын, камбайнаў і іншых складаных сельскагаспадарчых машын. Арганізаваныя за гэтыя гады калгасы значна ўмацаваліся і цвёрда стаяць на сваіх нагах. Створаны ўсе асноўныя прадпасылкі для быстрага ўздыму сельскай гаспадаркі. Калгасы разам з соўгасамі представляюць цяпер вялікую сілу ва ўздыме сельскай гаспадаркі і ўсёй народнай гаспадаркі.

Для таго, каб зрабіць гэту перабудову ў вёсцы, патрабавалася 6-7 год. І іменна на працягу гэтых 6-7 год, на працягу гэтага перыяда перабудовы сельскай гаспадаркі з аднаасобнай у калгасную, з дробнай у буйную з прыдачай ёй магутнага машыннага абсталявання, іменна на працягу гэтага перыяда, які быў неабходны для таго, каб замацаваць справу калектывізацыі, нам была патрэбна картачная сістэма ў снабжэнні хлебам. Як не выпадкова тое, што іменна ў даны момант мы ставім пытанне аб адмене картачнай сістэмы па хлебу, мупэ і крупе, так не выпадкова і тая акалічнасць, што іменна ў 1928 годзе партыя і ўрад фашылі ўвесці гэту картачную сістэму.

Чаму мы ўвялі картачную сістэму шэсць год таму назад? Таму, што мы хацелі забяспечыць ажыццяўленне палітыкі быстрай індустрыялізацыі нашай краіны, забяспечыць прынятыя партыяй тэмпы індустрыялізацыі, забяспечыць, не гледзячы на крайнюю адсталасць нашай сельскай гаспадаркі таго часу. Уся палітычная абстаноўка, унутраная і міжнародная, патрабавала ад нас гэтага. Гэта было неабходна і ў інтарэсах самой сельскай гаспадаркі, у інтарэсах паскарэння яе тэхнічнага перауздбаення.

Мы ўводзілі картачную сістэму не ў момант заняпаду народнай гаспадаркі. Не, мы і тады мелі вялікі ўздым прамысловасці. Але гэтаму ўздыму стала пагражаць адсталасць дробнага індывідуальнага сялянскага земляробства. Для таго, каб з-за адсталасці сельскай гаспадаркі не дапусціць зрыву прамысловасці, мы павінны былі асабліва паклапаціцца аб снабжэнні хлебам рабочых, аб снабжэнні хлебам гарадоў, а таксама сельскагаспадарчых раёнаў, даючых сыравіну для лёгкай прамысловасці.

Увядзенне картачнай сістэмы было нялёгкай справай. Але, як паказваюць факты, свайго мы дабіліся.

Мы здолелі забяспечыць няўхільны ўздым нашай прамысловасці на працягу ўсіх гэтых 6-7 год. Мы адстаялі тэмпы індустрыялізацыі. Мы паведаносна выканалі першую пяцігодку і з поспехам выконваем задачы другой пяцігодкі. Мы дабіліся таго, што індустрыялізацыя, дзеля якой трэба было забяспечыць поўны план снабжэння хлебам прамысловых цэнтраў і поўных сельскагаспадарчых раёнаў, што гэта індустрыялізацыя разгортвалася з года ў год у адпаведнасці з планам нашай дзяржавы, у адпаведнасці з лініяй партыі. Мы дабіліся таго, што індустрыя ў ходзе свайго ўздыму стварыла ўмацоўваючуюся з года ў год тэхнічную базу буйнай соцыялістычнай сельскай гаспадаркі. Рэзультаты гавораць самі за сябе. Гэта было-б немагчыма без адпаведнай арганізацыі снабжэння хлебам, без картачнай сістэмы.

Мы адмяняем цяпер рацыянаванне (картачную сістэму) па хлебу. Мы робім гэта ў момант, калі не толькі прамысловасць ідзе ўпэўнена ў гору, але калі і сельская гаспадарка ўжо стала на шлях быстрага ўздыму. У данай абстаноўцы адменай картачнай сістэмы і паўсюмесным разгортваннем шырокага гандлю хлебам і іншымі прадуктамі мы хочам забяспечыць далейшы ўзлём народнай гаспадаркі, новы і яшчэ больш буйны поспехі соцыялізма ў нашай краіне.

Перыяд 1928-1934 гг., звязаны з ажыццяўленнем картачнай сістэмы па хлебу, быў перыядам, калі мы ажыццяўлялі палітыку разгорнутага па ўсяму фронту наступу на капіталістычныя элементы і калі гэта палітыка, разам з усімі мерапрыемствамі партыі па соцыялістычнаму будаўніцтву, забяспечыла нам перамогу калгаснага ладу ў вёсцы. Цяпер справа калектывізацыі ў СССР у асноўным завершана. Цяпер наша сельская гаспадарка, у рашаючай сваёй частцы ўжо перабудаваная па соцыялістычнаму, уступіла ў паласу сапраўднага ўздыму і можа забяспечыць снабжэнне хлебам не так, як у мінулыя гады. Гэта відаць з вопыта мінулых год, і, асабліва, з вопыта хлебазагатовак і хлебазакупак у бягучым годзе. Як абстаяла справа со снабжэннем хлебам за прайшоўшы перыяд шасці—сямі год, калі ў нас дзейнічала картачная сістэма?

Перад намі стаяла задача — забяспечыць снабжэнне гарадоў і снабжэнне сельскагаспадарчых раёнаў, даючых сыравіну для прамысловасці. Перад намі, далей, стаяла задача — забяспечыць пераважнае снабжэнне галоўных прамысловых цэнтраў і першачарговае снабжэнне для поўных груп рабочага класа, перш за ўсё ўдарнікаў, — забяспечыць гэта снабжэнне на цвёрдых дзяржаўных цэнах у перыяд, калі базарныя цэны былі вельмі высокімі. І вось, не гледзячы на тое, што перыяд, аб якім ідзе гутарка, быў перыядам аграмаднага росту гарадоў і ўсё растучых загатовак тэхнічных культур у вёсцы, нам удалося ўтрымаць на патрэбным узроўні снабжэнне рабочых цэнтраў і забяспечыць снабжэнне хлебам раёны тэхнічных культур, даючыя сыравіну для прамысловасці.

Мы дасягнулі гэтага на шляху барацьбы за калгасную перабудову вёскі, на шляху разгорнутага наступу на кулака, на шляху няўхільнай барацьбы на хлебазагатоўчым фронце.

Калі мы ўводзілі картачную сістэму, нашы загатоўкі хлеба з ураджаю 1928 года складалі ўсяго 650 мільёнаў пудоў. З такой колькасцю хлеба мы не маглі аўладаць хлебным рынкам і пакончыць са спекуляцыяй хлебам.

З таго часу справа карэнным чынам змянілася.

У гэтым годзе па хлебапастаўках і хлебазакупках, асабліва дзякуючы поспеху хлебазакупак, якія мы праводзім па павышаных цэнах, мы зможам мець у распараджэнні дзяржавы не менш паўтара мільярда пудоў хлеба. Такім чынам, цяпер мы маем хлебныя рэсурсы, перавышаючыя ў два з лішнім разы тое, што мы мелі ў 1928 годзе.

Што датычыць харчовых культур, то тут мы маем яшчэ больш выразную карціну. У 1928 годзе мы загатовілі ўсяго 416 мільёнаў пудоў харчовых культур. У гэтым годзе мы можам разлічваць на тое, што ў руках дзяржавы іх будзе каля аднаго мільярда пудоў. Такім чынам, у гэтым годзе мы будзем мець харчовых культур амаль у два з паловай разы больш, чым у 1928 годзе. Гэтыя лічбы гавораць самі за сябе.

Як гэтыя паказальныя лічбы звязаны з адбыўшымися зменамі ў вёсцы, відаць з наступнага. Нават у 1929 годзе, калі ўжо паварот сялянства да калгасаў вызначыўся, 86 проц. загатоўленага хлеба належала аднаасобнікам і толькі 14 проц. — калгасам і соўгасам. Цяпер мы маем адваротную карціну. У гэтым годзе толькі 8 проц. хлебаздачы паступіла дзяржаве ад аднаасобнікаў і 92 проц. — ад калгасаў і соўгасаў. З гэтага відаць, што толькі дзякуючы калектывізацыі мы забяспечаны ў цяперашні час хлебам у непараўнальна большай ступені, чым гэта было некалькі год таму назад, калі ў вёсцы ўсюды пераважала дробная аднаасобная сялянская гаспадарка. Толькі калгасны лад, па меры ўмацавання сваіх пазіцый, стварыў разам з соўгасамі ўмовы, забяспечваючыя задавальненне растучых патрэб па снабжэнню хлебам гарадоў і раёнаў тэхнічных культур на працягу апошніх год. Толькі дзякуючы таму, што партыя з усёй энергіяй разгарнула барацьбу за калгасны лад у вёсцы і вяла барацьбу за забеспячэнне краіны індустрыялізацыі ў цэлым, мы дабіліся гэтых поспехаў у справе хлебазагатовак і ў справе снабжэння. Цяпер мы можам ісці ўперад яшчэ больш цвёрдым поступам.

Увядзенне картачнай сістэмы спаткала было праціўнікамі нашых ворагаў аб неміннучасці гібелі совецкай улады. Жыццё пасмяялася над гэтымі прарокамі.

Увядзенне картачнай сістэмы па хлебу было адной з акалічнасцей, узмацніўшых да крайнасці хістанні правых і лявацкіх элементаў у партыі. Спрахі і заклінанні правых і «левых» апартуністаў супроць цвёрдага курсу партыі на калектывізацыю ў вёсцы і супроць усёй палітыкі разгорнутага наступу па астатніх капіталізма разгуліся да крайнасці іменна ў сувязі з увядзеннем картачнай сістэмы. Партыя адстаяла сваю палітыку, з поспехам правяла яе ў жыццё, і цяпер у адмене картачнай сістэмы па хлебу мы не можам не бачыць новую перамогу партыі, перамогу, якая павінна выявіцца ў яшчэ большым ўздыме соцыялістычнай гаспадаркі і ў далейшым паляпшэнні снабжэння працоўных.

Так абстаіць справа з палітычнай ацэнкай вынікаў таго перыяда, да якога адносіцца картачная сістэма апошніх год.

II. КАРТАЧНАЯ СІСТЭМА І ПАДРЫХТОЎКА ЯЕ АДМЕНЫ

Што прадстаўляла з сябе картачная сістэма па хлебу, як яна развівалася за гэтыя гады і як практычна падрыхтоўвалася яе адмена?

Пачну з гарадоў. У арганізацыі снабжэння гарадскога насельніцтва заключалася наша першая задача.

У даны момант у нас знаходзіцца на цэнтралізаваным снабжэнні 40,3 мільёна чалавек, лічачы разам з сем'ямі. Як відома, у нас існуе некалькі катэгорый снабжэння, а іменна: асобы спіс — 10,3 мільёна чалавек, першы спіс — 11,8 мільёна чалавек, другі спіс — 9,6 мільёна чалавек, трэці спіс — 8,6 мільёна чалавек. Перавагі ў снабжэнні прадстаўлены асобаму і першаму спісам.

Аб росце кантынгентаў снабжэння за апошнія гады гаворыць наступная табліца:

	Увесь гарадскі кантынгент па снабжэнню хлебам (млн. чалавек)
1930 г	26
1931 г.	33,2
1932 г.	40,3
1933 г.	39,0
1934 г.	40,3

З гэтай табліцы відаць, як узрасталі кантынгенты снабжаўшыхся ў цэнтралізаваным парадку. Паніжэнне кантынгентаў цэнтралізаванага снабжання ў 1933 годзе тлумачыцца тым, што ў мінулым годзе, у сувязі з арганізацыяй ОРС'аў, снабжэнне рабочых было перадана непасрэдна ў рукі заводаў і гэта дазволіла ачысціць спісы рабочых і служачых ад рознага роду элементаў, не меўшых адносін да прадпрыемстваў і няправільна атрымліваўшых карткі.

Калі-ж узяць усю колькасць снабжаемых з дзяржаўных рэсурсаў, уключаючы і снабжэнне з мясцовых фондаў, то агульны кантынгент снабжэння ў даны момант будзе значна большы. Гэты кантынгент, куды ўвойдуць рабочыя, служачыя, студэнты, пенсіянеры і іншыя групы, складзе 25 мільёнаў чалавек. Да іх трэба дадаць 24 мільёны членаў сем'яў і адзін мільён саматужнікаў. У рэзультаце, увесь кантынгент снабжаемых з цэнтралізаваных і мясцовых фондаў складзе ў цяперашні час 50 мільёнаў чалавек і нават больш.

Для ажыццяўлення ўсёй гэтай сістэмы рацыянавання снабжэння гарадскога насельніцтва прыйшлося стварыць вялікі апарат, які каштуе значных грошай. Прыкладныя падлікі расходаў на гэты апарат паказваюць, што на абслугоўванне аднаго прымацаванага прыпадае не менш 8 рублёў расходаў у год. Гэта азначае, што абслугоўванне ўсяго кантынгента, прынятага на цэнтралізаванае снабжэнне па картках, патрабуе расходаў звыш 300 мільёнаў рублёў.

Няма чаго даказваць, што створаны для снабжэння па картках апарат дайшоў да велізарных памераў і страдае вялікімі бюракратычнымі злішествамі. Не гледзячы на гэта, картачная сістэма ў снабжэнні рабочых і служачых у гарадах пры ўсіх яе недахопах сваёй галоўнай мэты дасягнула. Яна забяспечыла снабжэнне рабочых і служачых па нізкіх цэнах, не гледзячы на тое, што базарныя цэны на хлеб і харчовыя прадукты ў гарадах стаялі на вельмі высокім узроўні.

Другая наша задача заключалася ў арганізацыі снабжэння сялянскага насельніцтва ў раёнах тэхнічных культур. Гэта праводзілася ў выглядзе так званага «атаварвання» хлебам здатлівых сельскагаспадарчай сыравіны для прамысловасці: бавоўнаробаў, ільнаводаў, табакаводаў і іншых. Гэта атаварванне было неабходна для стымулявання (заахвочвання) здачы сельскагаспадарчай сыравіны нашым загатоўчым органам. Апрача таго, атаварванне прымянялася і пры лесазагатоўках, пры загатоўцы пушнины на пушніне і ў некаторых іншых выпадках.

Усё гэта патрабавала вялікіх хлебных рэсурсаў ад дзяржавы. На адно снабжэнне бавоўнаробаў мы павінны былі расходаваць, напрыклад, у 1930 годзе каля 30 мільёнаў пудоў, а ў гэтым годзе ўжо звыш 39 мільёнаў пудоў. Пры загатоўцы ільну і пянькі ад нас патрабавалася ў 1930 годзе 5½ мільёнаў пудоў хлеба, а ў гэтым годзе — каля 11 мільёнаў пудоў.

З кожным годам расходы на атаварванне пры рознага роду загатоўках павялічваліся. Але без гэтага і немагчыма было забяспечыць рост гэтых загатовак.

А як ішоў гэты рост загатовак, відаць хоць-бы з наступнага: за перыяд з 1928 года да 1934 года загатоўкі бавоўны павялічыліся на 65 проц.; ільновалакна — на 70 проц.; табаку жоўтага — на 70 проц.; лесу — на 124 проц.; пушніны — на 128 проц.; здабыча рыбы — на 41 проц. Таварыш Клейнер, які больш за другіх знаём з гэтай справай, лічыць, што ў раёнах тэхнічных культур, дзякуючы атаварванню загатовак, мы з дзяржаўных фондаў часткова снабжаем хлебам каля 24 мільёнаў чалавек.

Як бачыце, справа ідзе аб буйным расходзе хлеба на снабжэнне гэтых сельскагаспадарчых раёнаў. Але мы павінны былі забяспечыць гэта снабжэнне з дзяржаўных хлебных фондаў па нізкіх цэнах, для таго, каб забяспечыць лёгкую прамысловасць сыравінай.

Зразумела, пры цяперашняй пастаноўцы справы, калі мы аддаем гэты хлеб па нізкіх дзяржаўных цэнах у раёнах, дзе на базарах цэны на хлеб стаяць на вельмі высокім узроўні, увесь парадак такога снабжэння супражон з вялікай колькасцю рознага роду злоўжываванняў і бюракратычных скажэнняў. У адмене гэтага парадку, і ва ўстанаўленні шырокага гандлю хлебам зацікаўлены і дзяржава і сялянскае насельніцтва гэтых раёнаў.

Партыя і ўрад вялі заўсёды барацьбу за палепшэнне арганізацыі снабжэння хлебам і іншымі прадуктамі. Нямала для гэтага было зроблена на працягу існавання картачнай сістэмы.

Акрамя таго, для палепшэння снабжэння рабочых прымаліся і іншыя меры.

Для гэтага былі шырока разгорнуты дэцэнтралізаваныя загатоўкі, якія давалі дадатковую колькасць прадуктаў для снабжэння рабочых і тым дапаўнялі снабжэнне, якое праводзілася ў цэнтралізаваным парадку. Нямала было зроблена для таго, каб стварыць уласную харчовую базу заводаў і фабрык, што таксама дапамагала палепшэнню снабжэння рабочых. Трэба ўказаць і на разгарнуўшаеся ў некаторых раёнах індывідуальнае агародніцтва рабочых і падсобныя меры.

Асаблівае значэнне мелі тыя меры, якія партыя і ўрад праводзілі па паляпшэнню гандлю.

Не гледзячы на ўсё значэнне картачнай сістэмы ў апошнія шэсць год, ЦК і Соўнарком аддавалі выключную ўвагу развіццю тавараазвароту, павелічэнню ролі гандлю. І гэта мела вялікае значэнне ў падрыхтоўцы адмены картачнай сістэмы.

Што зроблена для развіцця гандлю за апошнія гады? Тут галоўнае пытанне ў развіцці дзяржаўнага і кааперацыйнага гандлю. Мы маем і ў гэтай галіне не малыя дасягненні.

З 1928 года, калі колькасць дзяржаўных і кааперацыйных магазінаў і крам дасягнула 123 тысяч, яна павялічылася к цяперашняму часу да 283 тысяч. Такім чынам, дзяржаўна - кааперацыйная гандлёвая сетка вырасла больш чым у два разы. Пры гэтым прыватны гандаль хутка ішоў па шляху ліквідацыі. Калі ў 1928 годзе ў нас было яшчэ 215 тыс. прыватных магазінаў і крам (63 проц. усёй гандлёвай сеткі), уключаючы і самыя дробныя з іх, то цяпер прыватны гандаль блізкі да нуля. Але ў сувязі з гэтым не трудна зразумець, што цяперашняе развіццё дзяржаўна-кааперацыйнай сеткі яшчэ далёка недастатковае для таго, каб па-сапраўднаму абслугоўваць патрэбы гарадскіх і сельскіх спажыўцоў.

Асабліва быстра за апошнія гады развіваўся дзяржгандаль, які ў цяперашні час мае 36 проц. усёй гандлёвай сеткі. Тут нельга забываць, што дзяржаўныя магазіны і крамы, як правіла, буйней за кааперацыйныя.

Як павялічыўся рознічны тавараазварот, відаць з наступнага: у 1928 годзе ён вылічваўся ў 15,5 мільярда рублёў; у 1934 годзе, па меркавальных вылічэннях, ён складзе 61 мільярд рублёў. Напамінаю, што ў 1928 годзе сектар прыватнага гандлю складаў яшчэ 22½ проц., а цяпер ён, як было ўжо сказана, дасягі каля нуля.

ЦК і Соўнарком у апошнія гады не раз прымалі спецыяльныя меры для таго, каб абмежаваць імкненне к раздуванню нармаванага снабжэння харчовымі прадуктамі і таварамі ва ўпчэрб гандлю імі, не раз прымалі спецыяльныя меры, якімі пэўныя групы тавараў і прадуктаў забаранялася накіроўваць у нармаванае снабжэнне з тым, каб узмацняць звычайны гандаль імі. З той-жа мэтай праводзіліся абмежаванні фондаў цэнтралізаванага снабжэння рознага роду дзяржаўных арганізацый. Гэтым павялічваліся фонды тавараў, накіроўваемых у дзяржаўна-кааперацыйныя магазіны і крамы.

Асобае значэнне ў падрыхтоўцы адмены картачнай сістэмы мае развіццё камерцыйнага гандлю. На гэту справу была звернута вялікая ўвага. У рэзультаце гэтага ўдзельная вага камерцыйнага гандлю ў рознічным тавараазвароце ва апошнія чатыры гады значна падняслася. Вось адпаведныя лічбы па гадах:

1931 год	3 проц.
1932 »	11 »
1933 »	15 »
1934 » (чакаемае выкананне)	24 »

Калі ў агульным тавараазвароце камерцыйны гандаль у цяперашні час складае ўжо адну чэтвертку, то па прамысловых таварах (12 плануемых промтавараў) камерцыйны гандаль дасягае нават адной трэці. Камерцыйны гандаль стаў ужо буйным дапаўненнем к нармаванаму снабжэнню. Не гледзячы на тое, што цэны ў камерцыйным гандлі значна вышэйшыя за цэны на тавары ў нармаваным снабжэнні, па карткам, камерцыйны гандаль быстра развіваецца і патрабаванні на далейшае павелічэнне камерцыйнага гандлю паступаюць з усіх раёнаў краіны.

З пункту погляду падрыхтоўкі адмены картачнай сістэмы па хлебу трэба ўказаць на той факт, што розніца ў цэнах на хлеб паміж нармаваным гандлем па картках і камерцыйным гандлем за апошні час значна зменшылася. Адпаведныя меры мелі на ўвазе іменна падрыхтоўку адмены картачнай сістэмы на хлеб.

Нарэшце, аб калгасным гандлі. Гэты гандаль таксама быстра рос за апошні перыяд.

Па падліках Цэнтральнага кіраўніцтва народна - гаспадарчага ўліку, базарныя прывозы сельскагаспадарчых прадуктаў па 28 буйнейшых гарадах у 1934 годзе павялічыліся параўнальна з мінулым годам прыблізна на 75 проц. Гэта гаворыць аб шпарасці развіцця калгаснага гандлю.

Але дзякуючы развіццю дзяржаўнага камерцыйнага гандлю, адной з галоўных мэт якога была барацьба са спекуляцыяй ўздутымі цэнамі на базарах, мы маем у гэтым годзе значнае зніжэнне базарных цэн на хлеб і на іншыя харчовыя прадукты. Гэта відаць хоць-бы на прыкладзе Масквы. Пераўпоўваючы верасняўскія цэны гэтага года з цэнамі верасня мінулага года, мы маем паданне базарных цэн у Маскве па жытняму хлебу на 37 проц., па жытняй мупэ на 33 проц., па пшанічнаму хлебу на 25 проц., па пшанічнай мупэ на 47 проц. і па шпану на 44 проц.

Нам удалося ў немалой меры знізіць ўздутыя базарныя цэны ў Маскве і іншых гарадах. Гэтага-б не было без развіцця камерцыйнага гандлю.

Развіваючы дзяржаўна-кааперацыйны гандаль, усямерна падтрымліваючы рост камерцыйнага гандлю, а таксама спрыяючы калгаснаму гандлю, партыя і ўрад клапаціліся аб тым, каб справа дзяржаўнага рэгулявання гандлю не толькі не аслаблялася, а была-б паднята на належную вышыню. У сувязі з гэтым летам гэтага года па ініцыятыве таварыша Сталіна быў створан наркамат унутранога гандлю, на які кладуцца асабліва вялікія задачы ў сувязі з адменай картачнай сістэмы.

Цяпер, праўда, няма прыватнага гандлю, але быстра расце сетка дзяржаўных і кааперацыйных магазінаў і крам, растуць таксама калгасныя базары ў горадзе і вёсцы. І трэба, каб напрамак гэтага развіцця ішоў у інтарэсах дзяржавы і ў інтарэсах паляпшэння абслугоўвання ўзрастаючых запросаў насельніцтва. Фактамі даказана, што дзяржава аўладала рынкам больш, чым калі-б там ні было, і цяпер мае ўсе магчымасці быстрага развіцця тавараазвароту ў адпаведнасці з попытам спажыўцоў у горадзе і вёсцы.

Картачная сістэма, асабліва, паколькі справа ідзе аб хлебе, мупэ і крупах, адыграла сваю ролю. Цяпер нашы магчымасці і задачы іншыя.

Мы скарысталі картачную сістэму для таго, каб забяспечыць мэтамады ўздым прамысловасці і соцыялістычную перабудову ў сельскай гаспадарцы. Рэсурсы дзяржавы ў адносінах такіх важных прадуктаў, як хлеб, выраслі цяпер да небывалых яшчэ памераў. І таму прышоў час адмяніць картачную сістэму па хлебу і па некаторых іншых прадуктах. Прышоў час выявіцца ад гэтай абузы і паставіць справу па-новаму. Пераход к паўсямеснаму шырокаму продажу хлеба і мукі мы маем права разглядаць, як новую і буйную перамогу большэвіцкай палітыкі, як умову, аблягчаючую далейшы ўздым прамысловасці і сельскай гаспадаркі, і як важнейшую ўмову ў паляпшэнні снабжэння.

III. АБ МЕРАХ ПА ПРАВЯДЗЕННЮ АДМЕНЫ КАРТАЧНАЙ СІСТЭМЫ ПА ХЛЕБУ

У цяперашні час мы маем магчымасць паставіць пытанне аб адмене картачнай сістэмы па хлебу з студзеня 1935 года, бо дзяржава мае даволі вялікую колькасць хлеба. Затое ва ўсіх гарадах і сельскіх раёнах павінен быць арганізован гандаль хлебам і мукой на новых умовах.

Як абстаіць справа з хлебнымі рэсурсамі на будучы год, калі картачная сістэмы ўжо не будзе?

Асноўныя разлікі для гэтага ў нас ужо ёсць. Яны паказваюць, што ў 1935 годзе дзяржава будзе мець хлебны фонд, прыкладна, на 120 мільёнаў пудоў больш, чым у гэтым годзе. Мы безумоўна забяспечаны хлебам, у прыватнасці, на ўвесь перыяд 1935 года да новага ўраджаю.

Не можа быць сумнення ў тым, што пасля адмены картачнай сістэмы, з яе знадта нізкімі цэнамі на хлеб, у радзе раёнаў, дзе гэтыя нізкія цэны выклікалі на справе разбазарванне хлебных рэсурсаў, ранейшай колькасці хлеба не патрэбуецца. Але мы склалі разлік запасаў хлеба на будучы год такім чынам, каб была забяспечана нават такая малапраўдзівая магчымасць, як значнае павелічэнне попыту на хлеб і ў горадзе, і ў раёнах тэхнічных культур. Мы поўнасцю забяспечаем у будучым годзе і такое павелічэнне рынкавага попыту на хлеб.

Такім чынам, хлебам мы зараз забяспечаны пры адмене картачнай сістэмы поўнасцю і безумоўна. Апіраючыся на дасягнутыя поспехі ў выкананні плана па хлебапастаўках і на поспехі па хлебазакупках, якія яшчэ павінны быць замацаваны далейшай настойлівай работай у адстаючых абласцях і краях, мы можам пакончыць з карткамі па хлебу і тым зрабіць буйны крок наперад у паляпшэнні справы снабжэння.

У сувязі з гэтым, я лічу патрэбным паведаміць аб толькі што атрыманых ад Цэнтральнай дзяржаўнай камісіі па ўраджайнасці даных аб ураджаі зернавых хлябоў 1934 года. Гэтыя даныя пакуль трэба разглядаць у якасці папярэдніх, тым не менш яны заслугоўваюць сур'ёзнай увагі. Паводле падлікаў Дзяржкамісіі, ураджай зернавых хлябоў у гэтым годзе к моманту ўборкі быў, прыкладна, на ўзроўні мінулага года. Аднак, дзякуючы некаторраму палепшэнню ў арганізацыі ўборкі, у параўнанні з мінулым годам, у распараджэнні насельніцтва ў гэтым годзе хлеба будзе больш на 250-300 мільёнаў пудоў. Такім чынам, нашы першыя поспехі ў паляпшэнні барацьбы са стратамі ў часе ўборкі далі ўжо пэўныя рэзультаты, і ва ўсякім выпадку яны перакрываюць той урон ва ўраджаі, які мы мелі ў гэтым годзе ў паўднёвых раёнах Украіны.

Усё гэта дало магчымасць таварышу Сталіну паставіць пытанне аб адмене картачнай сістэмы па хлебу. Палітбюро ЦК далкам і поўнасцю ўхваліла прапанову таварыша Сталіна і ўносіць яе на зацвярджэнне пленума ЦК.

Як павінна быць праведзена адмена картачнай сістэмы па хлебу?

Зразумела, адмена картачнай сістэмы павінна быць праведзена такім чынам, каб не толькі не пагоршылася, а наадварот палепшылося снабжэнне рабочых і каб быў створаны прадпасылкі для палепшэння гэтай справы ў далейшым. Неабходна, далей, каб адмена атаварвання загатовак сыравіны не толькі не памяншала, а наадварот павялічвала зацікаўленасць сялян у вытворстве тэхнічных культур.

(ПРАЦЯГ НА 3 СТАР.)

АБ АДМЕНЕ КАРТАЧНАЙ СІСТЭМЫ ПА ХЛЕБУ

(Працяг даклада тав. В. М. МОЛАТАВА на пленуме ЦК ВКП(б) 25 лістапада г. г.)

Такава павінна быць практычная ўстаноўка пры адмене картачнай сістэмы і атаварвання загатовак.

Адмену картачнай сістэмы прапануецца правесці з 1 студзеня 1935 года, выкарыстаўшы бліжэйшыя тыдні для падрыхтоўкі к правядзенню гэтай меры. З 1 студзеня павінна быць адменена картачная сістэма па **хлебу, муцэ і крупах** усіх сартоў. Гэтым рашэннем будзе закладзен пачатак адмены картачнай сістэмы па **ўсіх** прадуктах і таварах.

Правядзенне гэтай меры магчыма і мэтазгодна на аснове ўстанаўлення для кожнай вобласці (рэспублікі) адзінай дзяржаўнай цаны па хлебу, муцэ і крупах ва ўсім рознічным дзяржаўна-кааперацыйным гандлі. Гэта адзіная рознічная цана па хлеб устанаўляецца прыкладна на сярэднім узроўні паміж існуючымі высокімі камерцыйнымі цэнамі і яўна нізкімі нармаванымі цэнамі.

Устанаўленнем адзінай цаны падсякаецца спекуляцыя хлебам, развіццё якой немінуча падштурхоўвалася існаваннем двух розных цэн на хлеб—высокай камерцыйнай цаны і нізкай нармаванай цаны. Затрудняецца спекуляцыя прывезеным з вёскі хлебам, бо попыт на рынку будзе забяспечан дзяржаўна-кааперацыйным гандлем хлебам па значна паніжанай цане супроць цяперашняй камерцыйнай цаны. Падрываецца і тая спекуляцыя хлебам, якою займаліся некаторыя элементы ў горадзе, атрымліваўшыя яго з ліпкам па картках па нізкіх нармаваных цэнах. Устанаўленне ў кожнай вобласці (рэспубліцы) адзінай дзяржаўнай цаны з'яўляецца мерапрыемствам першаступеннага гаспадарчага значэння.

Нова-ўстанаўляемыя цэны ў розных раёнах будуць неадналькавымі. Нельга захоўваць той парадак, які быў пры картачнай сістэме, калі не лічыліся з сапраўднымі ўмовамі збыту хлеба ў асобных раёнах, калі не лічыліся з сапраўднымі расходамі па транспарту і продажы хлеба ў розных мясцах краіны.

Па цяперашняму плану ўвесь СССР дзеліцца на восем паясоў па цэнах на хлеб.

Найбольш нізкія цэны, як было раней, астаюцца ў раёнах Сярэдняй Азіі, што неабходна для стымулявання вытворства бавоўны, так неабходнай нашай прамысловасці. Тут цана на жытні хлеб устанаўляецца ў 80 кап. за кілограм, а на пшанічны — 96-процантнага памолу — 90 кап. за кілограм. Да другога пояса, дзе адведныя цэны на 10 кап. вышэй, адносіцца большая частка Украіны і Паўночны Каўказ. Масква і цэнтральная паласа СССР адносяцца да трэцяга пояса, дзе цана на жытні хлеб устанаўляецца ў 1 руб. за кілограм, а на пшанічны хлеб — 1 р. 10 кап.

Найбольш высокія цэны ўстанаўляюцца для сёмага і восьмага паясоў. У сёмым поясе, куды адносіцца найбольш населеная частка Далёка-Ўсходняга края, цана на жытні хлеб устанаўляецца ў 1 руб. 30 кап. за кілограм, а на пшанічны хлеб—1 р. 40 кап. за кілограм.

Нарэшце, для асоба аддаленых раёнаў, як Камчатка, Сахалін, крайняя Поўнач, дзе асабліва вялікія транспартныя расходы, цана на жытні хлеб устанаўляецца ў 1 р. 50 кап. за кілограм і на пшанічны хлеб—1 руб. 60 кап. за кілограм.

Паколькі ўстанаўляецца шырокі продаж не толькі хлеба, але і мукі, вялікае значэнне мае ўстанаўленне правільных суадносін у цэнах паміж імі. Тут няма неабходнасці падрабязна спыняцца на гэтым. Укажу толькі на тое, што і на муку цэны ўстанаўляюцца па паясах, адведна цэнам на хлеб, але з тым, каб цана больш стымулявала куплю хлеба, чым куплю мукі.

У сувязі з гэтым яшчэ астрэй, чым раней, паўстае пытанне аб развіцці дзяржаўна-кааперацыйнага хлебапячэння. Адсталыя ў гэтых адносінах раёны павінны прыняць неадкладныя меры для развіцця хлебапячэння, што вельмі неабходна для паляпшэння снабжэння рабочых.

Змяненне цэн па хлебныя прадукты адабіецца і на цэнах у прамадскім харчаванні. Гэта асабліва адносіцца да круп. Нельга не прызнаць, што цяперашнія нармаваныя цэны на крупы перарылі растранжыраванню крупяных фондаў. Гэта відаць з наступнага. Кілограм тоўчанага проса ў нармаваным снабжэнні каштуе цяпер 27 кап., у той-жа час камерцыйная цана на крупы—5 руб. за кілограм. Паміж такі ненармальны разрыў паміж нармаванай і камерцыйнай цэнай—значыць захвочваць спекулянтаў і растранжыроўваць крупы, якія з'яўляюцца адным з каштоўнейшых прадуктаў масавага снабжэння.

З другога боку, у нас склаліся зусім неправільныя адносіны да бульбы. Бульба, якая ў другіх краінах з'яўляецца важнейшым харчовым прадуктам, у нас адыйшла на задні план і часамі безгаспадарча разбазарваецца. Між тым, бульба, ураджай якой у гэтым годзе асабліва высокі, можа ва многіх выпадках з поспехам замяняць крупы. У гэтым напрамку мы абавязаны прыняць неадкладныя меры.

Усё гэта паказвае напрамак, у якім павінна быць перабудавана сістэма снабжэння ў гарадах.

Паколькі з адменай картак цэны на хлеб некалькі павышаюцца, неабходна адначасова правесці адведнае павышэнне заработнай платы рабочых і служачых. У адрозненне ад майскага рашэння СНК і ЦК, калі павышэнне зарплаты адносілася толькі да нізка-аплачваемых рабочых і служачых, цяпер праводзіцца павышэнне заработнай платы па ўсіх катэгорыях рабочых і служачых. Гэта павышэнне будзе рознае па паясах, у адведнасці з паясовымі цэнамі на хлеб. Большае павышэнне заработнай платы праводзіцца ў тых мясцах, дзе снабжэнне хлебам далажам праводзілася па картках. Некалькі меншае павышэнне заработнай платы праводзіцца ў адносінах тых груп, якія адносіліся да другога і трэцяга спіса па снабжэнню.

Усё павышэнне заработнай платы, у сувязі з адменай картачнай сістэмы, павінна скласці 4.200 млн. руб. Гэта дае больш чым 10 проц. прыбаўкі к цяперашняму гадавому фонду заработнай платы.

Але, як відома, для значнай часткі гарадскога насельніцтва цяпер ужо мае вялікае значэнне купля хлеба ў камерцыйных магазінах. Паколькі-ж, у параўнанні з існуючымі камерцыйнымі цэнамі, устанаўляецца вельмі паніжаная цана на хлеб, у сярэднім на 30—35 проц., што выкліча і паніжэнне базарных цэн, то ўся гэта частка гарадскога насельніцтва па аднаму гэтаму ўжо значна выграе ад адмены картачнай сістэмы, не гаворачы ўжо аб павышэнні зарплаты.

Адным з важнейшых пытанняў, якое мы павінны зараз вырашыць, з'яўляецца пытанне аб цэнах на бавоўну, лён, пяньку, табак і іншыя віды сельска-гаспадарчай сыравіны, якія павінны быць цяпер павышаны ў сувязі з адменай атаварвання загатовак хлебам. Не спыняючыся на дэталях гэтай справы, я ўкажу напрамак, па якому мы пайшлі ў вырашэнні гэтага пытання.

Адмяняючы гэта атаварванне, мы ставім сваёй задачай не толькі не аслабіць інтарэс сялян і калгасаў да вытворства тэхнічных культур, а, наадварот, узмацніць гэты інтарэс і яшчэ больш садзейнічаць развіццю тэхнічных культур у нашай краіне. Такім чынам, ад адмены атаварвання хлебам бавоўнаводы, ільноводы, табакаводы і другія сяляне не толькі не прайграюць, а, наадварот, выйграюць. У гэтым сэнс правадзімага зараз павышэння цэн па сельскагаспадарчую сыравіну. Адведна таксама павышаюцца цэны здатчыкам пушнины, рыбакам, лесарубам і інш., дзе прымянялася стымулявание (заахвочванне) загатовак хлебам.

Зразумела, што павышэнне цэн на сельскагаспадарчую сыравіну выклікае вялікія дадатковыя расходы з боку дзяржавы. І тут справа ідзе аб некалькіх мільярдах рублёў дадатковых расходаў дзяржавы. Але, у сувязі з павышэннем прадажных цэн на хлеб, гэтыя расходы павінны акупіцца і не павінны адбіцца па прамысловых цэнах.

Са сказанага аб павышэнні заработнай платы і аб павышэнні цэн па сялянскую сыравіну для прамысловасці відаць, што побач з дадатковымі даходамі ў дзяржавы будуць вялікія дадатковыя расходы. Наша задача заключаецца ў тым, каб правесці гэта рашэнне такім чынам, каб расходы не перавысілі даходаў.

Нашы папярэднія разлікі паказваюць, што па даходах і расходах гэту рэформу можна правесці так-на-так. Мы і не можам ставіць сваёй мэтай, каб з правядзення данай меры дзяржава атрымала якія-небудзь дадатковыя даходы.

Адмена картачнай сістэмы ставіць рад новых практычных задач па паляпшэнню снабжэння хлебам насельніцтва.

Безумоўна неабходна развіццё гандлёвай сеткі. Адмена картачнай сістэмы павінна быць перабудавана сістэма снабжэння ў гарадах.

Адмена картачнай сістэмы прадугледжвае ліквідацыю гандлёвай сеткі, якая ў другіх краінах з'яўляецца важнейшым прадуктам, у нас адыйшла на задні план і часамі безгаспадарча разбазарваецца. Між тым, бульба, ураджай якой у гэтым годзе асабліва высокі, можа ва многіх выпадках з поспехам замяняць крупы. У гэтым напрамку мы абавязаны прыняць неадкладныя меры.

Усё гэта паказвае напрамак, у якім павінна быць перабудавана сістэма снабжэння ў гарадах.

Паколькі з адменай картак цэны на хлеб некалькі павышаюцца, неабходна адначасова правесці адведнае павышэнне заработнай платы рабочых і служачых. У адрозненне ад майскага рашэння СНК і ЦК, калі павышэнне зарплаты адносілася толькі да нізка-аплачваемых рабочых і служачых, цяпер праводзіцца павышэнне заработнай платы па ўсіх катэгорыях рабочых і служачых. Гэта павышэнне будзе рознае па паясах, у адведнасці з паясовымі цэнамі на хлеб. Большае павышэнне заработнай платы праводзіцца ў тых мясцах, дзе снабжэнне хлебам далажам праводзілася па картках. Некалькі меншае павышэнне заработнай платы праводзіцца ў адносінах тых груп, якія адносіліся да другога і трэцяга спіса па снабжэнню.

Усё павышэнне заработнай платы, у сувязі з адменай картачнай сістэмы, павінна скласці 4.200 млн. руб. Гэта дае больш чым 10 проц. прыбаўкі к цяперашняму гадавому фонду заработнай платы.

Але, як відома, для значнай часткі гарадскога насельніцтва цяпер ужо мае вялікае значэнне купля хлеба ў камерцыйных магазінах. Паколькі-ж, у параўнанні з існуючымі камерцыйнымі цэнамі, устанаўляецца вельмі паніжаная цана на хлеб, у сярэднім на 30—35 проц., што выкліча і паніжэнне базарных цэн, то ўся гэта частка гарадскога насельніцтва па аднаму гэтаму ўжо значна выграе ад адмены картачнай сістэмы, не гаворачы ўжо аб павышэнні зарплаты.

Адным з важнейшых пытанняў, якое мы павінны зараз вырашыць, з'яўляецца пытанне аб цэнах на бавоўну, лён, пяньку, табак і іншыя віды сельска-гаспадарчай сыравіны, якія павінны быць цяпер павышаны ў сувязі з адменай атаварвання загатовак хлебам. Не спыняючыся на дэталях гэтай справы, я ўкажу напрамак, па якому мы пайшлі ў вырашэнні гэтага пытання.

Адмяняючы гэта атаварванне, мы ставім сваёй задачай не толькі не аслабіць інтарэс сялян і калгасаў да вытворства тэхнічных культур, а, наадварот, узмацніць гэты інтарэс і яшчэ больш садзейнічаць развіццю тэхнічных культур у нашай краіне. Такім чынам, ад адмены атаварвання хлебам бавоўнаводы, ільноводы, табакаводы і другія сяляне не толькі не прайграюць, а, наадварот, выйграюць. У гэтым сэнс правадзімага зараз павышэння цэн па сельскагаспадарчую сыравіну. Адведна таксама павышаюцца цэны здатчыкам пушнины, рыбакам, лесарубам і інш., дзе прымянялася стымулявание (заахвочванне) загатовак хлебам.

Зразумела, што павышэнне цэн на сельскагаспадарчую сыравіну выклікае вялікія дадатковыя расходы з боку дзяржавы. І тут справа ідзе аб некалькіх мільярдах рублёў дадатковых расходаў дзяржавы. Але, у сувязі з павышэннем прадажных цэн на хлеб, гэтыя расходы павінны акупіцца і не павінны адбіцца па прамысловых цэнах.

Са сказанага аб павышэнні заработнай платы і аб павышэнні цэн на сялянскую сыравіну для прамысловасці відаць, што побач з дадатковымі даходамі ў дзяржавы будуць вялікія дадатковыя расходы. Наша задача заключаецца ў тым, каб правесці гэта рашэнне такім чынам, каб расходы не перавысілі даходаў.

Нашы папярэднія разлікі паказваюць, што па даходах і расходах гэту рэформу можна правесці так-на-так. Мы і не можам ставіць сваёй мэтай, каб з правядзення данай меры дзяржава атрымала якія-небудзь дадатковыя даходы.

Адмена картачнай сістэмы ставіць рад новых практычных задач па паляпшэнню снабжэння хлебам насельніцтва.

Безумоўна неабходна развіццё гандлёвай сеткі. Адмена картачнай сістэмы павінна патрэбаваць вялікай практычнай работы, павінна патрэбаваць быстрай перабудовы цяперашняй грамоздкай і непрактычнай сістэмы снабжэння. На адведныя цэнтральныя і на ўсе мясцовыя органы кладзецца вялікая адказнасць за правільнае і быстрае правядзенне гэтых мер.

І ў гэтай справе злачынна пакладацца на самацёк.

Нераспарадчасць і бюракратызм, якімі так багата была картачная сістэма, могуць даць сябе моцна адчуць там, дзе не будзе належнага кіраўніцтва і кантролю за правядзеннем перабудовы снабжэння. Антысавецкія элементы будуць злараствацца па кожнаму поводу, які ім прадставіцца там, дзе перабудову папрабуюць аддаць у рукі канцэлярыстаў і аматараў папяровых загадаў, а не возьмуць у надзейныя рукі саміх кіруючых савецкіх і партыйных органаў.

Аб гэтым у рабочых раёнах асабліва павінны падумаць тыя, хто да гэтага часу не пакладаецца аб развіцці гандлёвай сеткі і, асабліва, хлебапячэння. У раёнах тэхнічных культур трэба своечасова даць адпор спробам падарваць давер'е да дзяржавы, рашэнне якой ідзе цяпер насустрач шырокім масам бавоўнаводаў, ільнаводаў, табакаводаў і наогул насустрач працоўным сялянам і калгасам.

IV. АБ ЗНАЧЭННІ АДМЕНЫ КАРТАЧНАЙ СІСТЭМЫ ПА ХЛЕБУ

Сэнс адмены картачнай сістэмы на хлеб заключаецца ў далейшым паляпшэнні снабжэння гарадоў і сельскіх рабочых, у лепшым задавальненні запросаў насельніцтва. Замена картачнай сістэмы гандлем з'яўляецца адным з лепшых паказальнікаў росту сіл Савецкага Саюза, паказальнікам перадавому ў сельскай гаспадарцы, паказальнікам новых поспехаў соцыялізма ў нашай краіне. Мы сталі мацней і таму адмяняем картачную сістэму. Мы адмяняем картачную сістэму, бо хочам зрабіць новы крок уперад у паляпшэнні снабжэння насельніцтва.

Гэта рашэнне будзе мець аграмаднае значэнне для ўсёй народнай гаспадаркі. Яго значэнне не зводзіцца толькі да паляпшэння снабжэння. Яго значэнне значна большае. Значэнне адмены картачнай сістэмы скажацца ва ўсім гаспадарчым жыцці краіны і ў далейшым яе палітычным умацаванні.

Галоўнае, аб чым трэба зараз сказаць, гэта аб развіцці савецкага гандлю і аб умацаванні нашага рубля.

Яшчэ XVII партыйная канферэнцыя ў дырэктывах аб другім пяцігадовым плане сказала:

«Толькі на аснове разгортвання таваразвароту магчыма забяспечыць далейшае быстрае паляпшэнне снабжэння рабочых і працоўных вёскі прамысловымі таварамі і прадуктамі сельскай гаспадаркі, для чаго ў сваю чарту неабходна ўсямернае расшырэнне сеткі магазінаў, крам і ўсёй гандлёвай сеткі з правядзеннем неабходнай тэхнічнай яе рэканструкцыі. Толькі на гэтай аснове магчыма **падрыхтаваць адмену нармавання водпуску тавараў і замяніць сістэму цэнтралізаванага размеркавання разгорнутым савецкім гандлем».** (Курсіў мой.—**В. М.**).

Наша рашэнне аб адмене картачнай сістэмы па хлебу будзе азначаць, што мы паспяхова ажыццяўлем важнейшыя задачы другой пяцігодкі. Перад намі была пастаўлена задача — «падрыхтаваць адмену нармавання водпуску тавараў і замяніць сістэму цэнтралізаванага размеркавання разгорнутым савецкім гандлем». Нельга не прызнаць, што партыя і ўрад не мала зрабілі для гэтага. Правядзеннем гэтай дырэктывы і з'яўляецца адмена картачнай сістэмы па хлебу. Гэтым мы робім новы і рашучы крок да адмены сістэмы цэнтралізаванага размеркавання ў цэлым, да шырокага разгортвання савецкага гандлю.

Асновай разгортвання гандлю партыя заўсёды лічыла палітыку зніжэння цэн на тавары. Цяпер стварацца спрыяючыя ўмовы для правядзення гэтай палітыкі.

Тут аб зніжэнні цэн прыходзіцца гаварыць не ў адносінах да нармаваных цэн, даўно адарваўшыхся ад рынку. Замена-ж высокіх камерцыйных цэн значна больш нізкімі новымі дзяржаўнымі цэнамі неадкладна выкліча і зніжэнне базарных цэн. Знізяцца не толькі цэны на хлеб, але і цэны на другія прадукты.

З другога боку, нельга прадставіць, што значнае зніжэнне базарных цэн на хлеб, якое будзе немінуча пасля ўвядзення адзінай дзяржаўнай цаны на хлеб, абыйдзецца без значнага зніжэння базарных цэн па другія прадукты. Можна таксама не сумняваццa ў тым, што мы атрымаем магчымасць і далейшага зніжэння цэн, устанаўляемых цяпер на хлеб, муку і крупы. З гэтага відаць, што палітыка зніжэння цэн атрымае практычнае ажыццяўленне ўжо ў бліжэйшы час.

Што атрымаецца з цэнамі на прамысловыя тавары? І ў гэтых адносінах, паколькі справа ідзе аб камерцыйных і рынкавых цэнах, мы безумоўна будзем мець зніжэнне цэн. Указанае павышэнне заработнай платы не можа павесці к павышэнню цэн на промтавары. Гэта павышэнне заработнай платы вазмяшчаецца дзяржавай за кошт даходаў ад павышэння цэн на хлеб, які выдаваўся раней па картках.

Цяпер у нас ствараюцца моцныя прадпасылкі для зніжэння цэн як на харчовыя, так і на прамысловыя тавары. Дарогу к зніжэнню цэн укажа ўстанаўленне адзіных дзяржаўных цэн на хлеб, муку і крупы. А кожнаму зразумела, што зніжэнне цэн з'яўляецца важнейшай умовай росту добрабыту працоўных горада і вёскі, г. зн. насельніцтва ўсёй краіны.

Умацуецца і савецкі рубель. Калі цяперашняя дваістасць цэн аслабляла яго значэнне, то адзіныя цэны на хлеб яго ўмацуюць. Практычнае правядзенне палітыкі зніжэння цэн і знойдзе сваё агульнае выражэнне ва ўмацаванні савецкага рубля.

Такое ўмацаванне савецкага рубля ў інтарэсах працоўных. Яно зробіць цвярдзейшымі нашы планы. Яно павядзе да аздараўлення дзяржаўнага апарата. Яно ўмацуе саюз рабочых і сялян, аблегчыць далейшы ўздым народнай гаспадаркі і рост соцыялізма ў нашай краіне.

Умацаванне рубля ўзніме значэнне заработнай платы ў прамысловасці. І на прадпрыемствах і на будоўлях пытанні заработнай платы патрэбуюць да сябе ўзмоцненай увагі.

Нацеракор катэгарычным патрабаванням партыі і ўрада, у нас на практыцы да гэтага часу нярэдка існавалі пагардлівыя адносіны да гэтых пытанняў. Пакуль грашовая зарплата была не галоўным, а толькі адным з элементаў у аплаце працы рабочых, што было немінуча пры картачнай сістэме, да тых пор у пэўнай меры падрывалася і яе роля ў вытворчасці і ў будаўніцтве. Цяпер заработная плата ператвараецца ў асноўны рэгулятар, а яе павышэнне — у рашаючы стымул для рабочых і служачых. І гэта павінна павесці да вялікага ўзмацнення ролі зарплаты і ў вытворчасці, і ў будаўніцтве.

Устанаўленне паясных цэн на хлеб выкліча дыферэнцыацыю (рознасць) у прыбытках па заработнай плаце. Гэта дыферэнцыяцыя неабходна і толькі падкрэслівае недапушчальнасць ураўнілаўскага падыходу да справы заработнай платы. Між тым выгнаць дробнабуржуазнай ураўнілаўкі з галіны заработнай платы да гэтага часу яшчэ прасоўваецца туга. А без гэтага не можа быць і правільнай арганізацыі матэрыяльнага заахвочвання лепшых работнікаў, чэсных у сваёй рабоце, што неабходна не толькі ў іх інтарэсах, але і ў інтарэсах пролетарскай дзяржавы.

З усяго гэтага следуе, што пытанні заработнай платы ў вытворчасці, ва ўсёй прамысловасці, а таксама на транспарце і ў сельскай гаспадарцы набываюць у цяперашніх умовах першаступеннае значэнне.

Да чаго часамі даходзілі бесклапотныя адносіны да грошай — відаць хоць-бы з наступнага: у некаторых нашых будаўнікоў увайшоў нават ва ўжытак новы выраз: «асвоіў такую-та суму грошай». А «асвоіў» тут значыць усяго-на-ўсяго выдаткаваў.

Але кожнаму зразумела, што не ўсякае выдаткаванне грошай з'яўляецца дасягненнем. Аб поспехах будаўніцтва трэба судзіць не проста па суме, «асвоенай» на будоўлі, а па фактычных рэзультатах, атрыманых ад выдаткаванай сумы. Асвоіць адпушчаныя дзяржавай сродкі поўнасцю, а зладзь дзяржаве за гэта толькі палову назначанай планам будоўлі — значыць зрабіць злачынства супроць інтарэсаў рабочага класа, бо гэта мяжуе з растратай дзяржаўных сродкаў. Пара пакончыць з такога роду «асваеннем» дзяржаўных сродкаў.

Трэба, каб усе будаўнікі навучыліся сур'ёзна лічыць грошы. Гэта палепшыць наша будаўніцтва, гэта вельмі дапаможа нашаму гаспадарчаму росту.

І так, мы стаім перад задачай **разгарнуць гандаль і ўмацаваць наш рубель.** У гэтым цяпер заключаецца важнейшая ўмова росту нашай соцыялістычнай краіны.

Нарэшце, галоўнае тут — у разгортванні таваразвароту. Насустрач гэтаму і ідзе рашэнне аб адмене картачнай сістэмы па хлебу. Картачную сістэму можа замяніць толькі шырокі гандаль, сёння — па хлебу, заўтра — і па іншых таварах.

Трэба зразумець, у якіх умовах гэта адбываецца і аб якім гандлі зараз гаворыцца.

Цяпер не толькі ўся прамысловасць знаходзіцца ў нас у руках дзяржавы. Цяпер і сельская гаспадарка ў асноўным ужо завяршыла соцыялістычную перабудову. Усё асноўнае ў сельскай гаспадарцы цяпер у калгасах і соўгасах. Нарэшце, сам таваразварот як у горадзе, так і ў вёсцы таксама знаходзіцца ў руках дзяржавы і ў непарыўна звязанай з ім кааперацыйнай сістэмы.

Калі цяпер мы гаворым аб разгортванні гандлю, мы гаворым аб таваразвароце паміж соцыялістычным горадам і калгаснай вёскай. Астаткі капіталізма яшчэ жывы. За адпасобнай гаспадаркай яшчэ стаіць частка сялянства. Але ўсе рашаючыя пазіцыі ў сельскай гаспадарцы ўжо заняты калгасамі і соўгасамі. Таму становішча і роля гандлю, як і савецкага рубля, зусім не тыя, што былі, скажам, дзесяць год таму назад.

У цяперашніх умовах разгорнуты гандаль улівае новыя сілы ў соцыялістычны горад і ў калгасную вёску. Развіццё савецкага гандлю стала важнейшай умовай росту соцыялістычнай гаспадаркі, важнейшай умовай пабеданоснага соцыялізма ў яго прасоўванні наперад.

Аб якім гандлі ідзе гутарка, лепш за ўсё сказаць словамі таварыша Сталіна на стуженьскім пленуме ЦК мінулага года. Таварыш Сталін гаварыў тады:

«Паміж савецкім гандлем, у тым ліку калгасным гандлем, і гандлем першай стадыі нэпа існуе карэнная розніца. На першай стадыі нэпа мы дапускалі ажыўленне капіталізма, дапускалі прыватны таваразварот, дапускалі «дзейнасць» прыватных гандляроў, капіталістаў, спекулянтаў.

Гэта быў больш або менш свабодны гандаль, абмежаваны толькі рэгулюючай роллю дзяржавы. Тады прыватна-капіталістычны сектар у таваразвароце краіны займаў даволі вялікае месца».

Таварыш **Сталін** гаварыў далей аб тым, як змянілася справа ў апошнія гады:

«Калі гандаль на першай стадыі нэпа дапускаў ажыўленне капіталізма і фушкцыянаванне прыватна-капіталістычнага сектара ў таваразвароце, то савецкі гандаль выходзіць з адмаўлення як таго, так і другога. Што такое савецкі гандаль? Савецкі гандаль ёсць гандаль без капіталістаў — малых і вялікіх, гандаль без спекулянтаў—малых і вялікіх. Гэта асобага роду гандаль, якога не ведала да гэтых пор гісторыя і які практыкуем толькі мы, большэвікі, ва ўмовах савецкага развіцця».

І так, цяпер справа ідзе аб развіцці гандлю без прыватнікаў, без капіталістаў, без спекулянтаў, справа ідзе аб развіцці **савецкага** гандлю. Шырокае развіццё гэтага **савецкага** гандлю стала адной з рашаючых умоў усяго нашага гаспадарчага росту і ўмацавання рабоча-сялянскай змычкі.

Нават у гады нэпа, калі жывы быў прыватнік-капіталіст у гандлі, змычка нашай прамысловасці з сельскай гаспадаркай праз гандаль і снабжэнне машынамі забяспечыла нам падрыхтоўку і правядзенне соцыялістычнай перабудовы вёскі. І гады развіццё гандлю мела першаступеннае значэнне для росту сіл соцыялізма ў нашай краіне. У цяперашніх умовах калі справа ідзе аб развіцці **савецкага** гандлю, аб гандлі без капіталістаў, разгортванне таваразвароту паміж горадам і вёскай будзе мець не меншае значэнне для далейшага соцыялістычнага росту краіны.

Мы прыступаем да адмены картачнай сістэмы, пачынаючы з хлеба, і гэтым адкрываем шырокую дарогу для развіцця савецкага гандлю. У новых умовах і пановаму гандаль і грошы павінны служыць справе комунізма. І мы можам не сумняваццa, што яны саслужаць нам яшчэ вялікую службу. Няхай-жа паслужаць яны гэтай справе добра!

Мы ідзем упэўнена наперад. І ў гэтым знаходзіць сваё выражэнне правільнасць палітыкі нашай партыі!

РАБОЧЫЯ І КАЛГАСНІКІ БССР АДНАДУШНА ВІТАЮЦЬ ГІСТАРЫЧНЫЯ ПАСТАНОВЫ ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б)

1. Рабочыя завода імя Молатава ў часе абедзенага перапынку чытаюць пастанову пленума ЦК ВКП(б) аб адмене картачак.

ВІЦЕБСК

Пасля атрымання рэзалюцыі пленума ЦК ВКП(б) аб адмене картачнай сістэмы па хлебу і некаторых іншых прадуктах, 29 і 30 лістапада на ўсіх прадпрыемствах горада, чыгуначным вузле, у навучальных установах, школах і ўстановах адбыліся масавыя сходы і мітынгі, на якіх працоўныя Віцебшчыны падрабязна азнаёміліся з рэзалюцыяй пленума. Усюды рашэнні пленума знайшлі аднадушнае адабрэнне і ацэнены як новая вялікая перамога ў палітыцы партыі, якая вядзе працоўных Совецкага Саюза па шляху да светлага заможнага жыцця.

— Мы яшчэ раз пераканаліся ў сіле і празорлівасці вялікага ідэйнага правадыра сусветнага пролетарыята таварыша **Сталіна**, навочна пераканаліся ў ажыццяўленні яго слоў аб апошнім годзе нашых трудпасцей.

— Адмена картачнай сістэмы на хлеб—лепшы гэтаму доказ,—у адзін голас заявілі рабочыя швейнага гіганта фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі».

Тут-жа на сходах у адказ на пастанову пленума 5-тысячны рабочы калектыў фабрыкі абяцаў прыкласці ўсе сілы на высокаякаснае выкананне промфінплана 1934 года, разгортванне большэвіцкай барацьбы за гонар і славу фабрычнай маркі.

На рабочым сходзе чырвонасцяжнага завода «Чырвоны металіст», выражаючы мысль усяго рабочага калектыва, стары кадравік—слесар тав. Піскуноў заявіў:

— У нашых сэрцах пастанова пленума знаходзіць адну толькі пахвалу і аднадушнае адабрэнне. Рашэнне пленума яшчэ адзін доказ вялікіх клопатаў партыі і ўрада аб нас, рабочых і працоўным сялянстве, аб тым, каб добрабыт працоўных Совецкага Саюза паляпшаўся з кожным днём.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

МАГІЛЕЎ

На ўсіх прадпрыемствах горада адбыліся мітынгі, прысвечаныя рашэнню пленума ЦК ВКП(б) аб адмене картачнай сістэмы.

На шаўковай фабрыцы, заводах імя Сталіна, імя Молатава, швейнай фабрыцы на мітынгі з'явілася амаль 100 проц. рабочых. Паўсямесна рабочыя вітаюць рашэнне пленума.

Рабочыя шаўковай фабрыкі абавязаліся ў адказ на рашэнне партыі яшчэ больш мабілізаваць свае сілы, каб у падарунак VII з'езду советаў выпусціць звыш плана на 5 млн. руб. прадукцыі, давёўшы процант 1-га і 2-га гатункаў да 95.

Рабочыя матальнага цэха абавязаліся аказаць усямерную дапамогу кааперацыі ў рэалізацыі рашэння пленума.

ЛЁЗНА

Калгаснікі Лёзны сустрэлі рашэнні пленума ЦК ВКП(б) з вялікім энтузіязмам. 300 калгаснікаў, прысутных на спецыяльне скліканым сходзе ў Дабрамыслянскім сельсавеце, па дакладу сакратара РК тав. **ДЗЕНІСКЕВІЧА** аб рашэннях пленума вынеслі рашэнне, аднагалосна адабраючае пастановы пленума ЦК. б прамоўцаў, што выступілі на сходзе, падкрэслілі, што адмена картачнай сістэмы ёсць лепшы доказ вялікіх клопатаў партыі і ўрада аб узняцці добрабыту рабочых і калгасных мас краіны.

Калгаснік калгаса «Шлях большэвіка», стары ільнавод **КАПЛУНОЎ** у сваім выступленні заявіў:

— Адмена картачнай сістэмы, адмена выдачы хлеба на загатаўляемыя с.-г. прадукты і ў сувязі з гэтым павелічэнне цэн на загатоўленыя с.-г. прадукты з'яўляюцца лепшым стымулам для далейшага ўзняцця ўраджайнасці ільну, паляпшэння якасці яго апрацоўкі.

Старшыня калгаса імя Фрунзе **ЕЎТУХОЎСКІ** заявіў:

— Картачная сістэма патрэбна была ў свой час. Цяпер, дзякуючы калгаснаму ладу, урад мае даволі хлеба, каб адмяніць сістэму картачнага яго размеркавання. Гэта рашэнне пленума,—гаворыць далей Еўтухоўскі, — лепшы доказ росквіту нашай краіны.

Калгаснік калгаса «Полымя» **ЦІТАЛЕНКА** на прыкладах свайго калгаса расказаў аб вялікай рабоце, праробленай палітаддзеламі.

— Наш калгас «Полымя»,—гаворыць т. Ціталенка, — з самага адстаючага ў раёне пры непасрэдным кіраўніцтве палітаддзела за вельмі кароткі час вышаў у перадавыя калгасы раёна. Рашэнне пленума аб ліквідацыі палітаддзелаў, — гаворыць Ціталенка, — ёсць новае мерапрыемства партыі, накіраванае на далейшае ўмацаванне калгасаў, на паспяховае выкананне лозунга таварыша Сталіна аб ператварэнні калгасаў у большэвіцкія, в калгаснікаў у заможныя.

У адзнаку рашэнняў пленума калгаснікі Дабрамыслянскага сельсавета арганізавалі чырвоны абоз з ільновалакном, мясам і хлебам.

ФОНКАЦ.

СЛУЦАК

З вялікім уздымам працоўных Случчыны сустрэлі рашэнне пленума ЦК ВКП(б) аб адмене картачнай сістэмы на хлеб і іншыя прадукты.

Пастанова прапрацавана на раённым злёце ударнікаў фінфронта разам з старшынямі сельсоветаў. Злёт абавязаўся 5 снежня выканаць фінплан і скончыць хлебазакупчі. У адказ на пастанову пленума калгас «Першае мая» дадаткова прадаў 15 тон хлеба.

За рубяжом

ГЕРМАНСКІЯ ВОДГУКІ НА РАШЭННІ ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б)

БЕРЛІН, 30 лістапада. (Інфармацыя «Праўды»). Германскі друк працягвае вялікую цікавасць к рашэнням пленума ЦК ВКП(б). Газеты прыводзяць падрабязныя інфармацыйныя тэлеграмы з Масквы, у якіх даюць рашэнні пленума. Асабліва адзначаецца рэзалюцыя аб адмене картачнай сістэмы на хлеб.

«Дойче альгемейне цейтунг» падкрэслівае, што гэтым рашэннем рэйхстаг значны смелы крок наперад на шляху павышэння пакупной сілы рубля і развіцця тавараабароту.

ТЭФІК РУШЮ-БЕЙ АБ МІРНАЙ ПАЛІТЫЦЫ СССР

ПАРЫЖ, 30 лістапада. (БЕЛТА). Турэцкі міністр замежных спраў Тэфік Рушю-бей, які знаходзіцца зараз у Парыжы, у гутарцы з супрацоўнікам «Энфармасьён» заявіў: «Агульнавядома, што Турцыя з'яўляецца другам Совецкага Саюза. Я горача і свядома імкнуся развіць гэту дружбу яшчэ больш. З 1920 года я імкнуся да гэтай мэты, і з самага пачатку глава турэцкага ўрада ўказаў нам гэты шлях. Я маю абсалютную ўпэўненасць, што роля, якую адыгрывае Совецкі Саюз на міжнародным арэне, не можа быць ніякай іншай, апрача мірнай».

РОСТ БЕСПРАЦОЎЯ У ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 30 лістапада. (БЕЛТА). Глава жоўтай амерыканскай федэрацыі працы Грын заявіў, што ў надыходзячую зіму беспрацоўе дасць сябе адчуць астрай чым калі-небудзь за час з пачатку крызіса. У кастрычніку ў Злучаных Штатах было 10.671 тысяча беспрацоўных. Лік асоб, якія патрабуюць дапамогі павялічыўся ў параўнанні з кастрычнікам мінулага года на 30 проц.

СПРЭЧКІ У ЯПОНСКІМ ПАРЛАМЕНЦЕ

ТОКІО, 30 лістапада. (БЕЛТА). Сёння пачалася работа надзвычайнай сесіі парламента: былі заслуханы прамовы Окада аб агульнай палітыцы, Хірота — аб знешняй палітыцы і Такахасі — аб мерах дапамогі раёнам, пацярпеўшым ад стыхійных няшчасцяў.

Прамова Окада цягнулася 10 мінут. Ён не закрануў ніякіх буйных пытанняў, а абмежаваўся ўказаннем, што пасля стварэння цяперашняга кабінета была апублікавана ўрадавая дэкларацыя і што таму пінер даволі абмежавацца выкладаннем мэт надзвычайнай сесіі, скліканай для разгляду мерапрыемстваў па аказанню дапамогі раёнам, пацярпеўшым ад стыхійных няшчасцяў.

Пасля прамоў Окада, Хірота і Такахасі ў абедвух палатах пачаліся запытанні. Першае запытанне ў верхняй палаце было зроблена членамі групоўкі Досікай - Като, указаўшым на недахопы сістэмы народнай асветы. Окада і Мацуда запэўнілі Като ад імя ўрада, што яны прыкладуць усе намаганні, каб палепшыць сістэму народнай асветы.

ВОДГУКІ АНГЛІЙСКАГА, ФРАНЦУЗСКАГА І СКАНДЫНАЎСКАГА ДРУКУ НА ВЫСТУПЛЕННЕ БАЛДУІНА

Дыпламатычны наглядальнік «Морнінг пост» (Лондан) заяўляе, што змешчаны ў прамове англійскага міністра Балдуіна ў палаце абшчын заклік Германіі не адгараджвацца ад сваіх суседзей з'явіўся па сутнасці заклікам Германіі вярнуцца ў Лігу нацый. Частка французскага друку, якая займае непрымірымую пазіцыю ў адносінах германскіх знешнепалітычных манеўраў, выказвае сваё нездавальненне па повяду спрэчак у англійскім парламенце. «Журналь дэ дэба» адзначае, што Балдуін папракае Германію не столькі за яе ўзбраенне, колькі за тайну, якой яна акутвае гэтыя ўзбраенні.

«Створаецца ўражанне, — піша газета, — што калі-б Германія згадзілася расказаць аб тым, што яна ужо паспела ажыццявіць, то гэтыя рэзультаты можна было легалізаваць».

Больш стрымана выказваюцца блізкія к міністэрству замежных спраў газеты.

СЯЛЯНСКІ УРАД У ГАРЫСТЫМ РАЁНЕ КУБЫ

НЬЮ-ЙОРК, 30 лістапада. (БЕЛТА). «Асашыэйтэд прэс» паведамляе з Гаванны—са слоў кубінскага міністра юстыцыі, што ў гарыстым раёне Рэаленга на тэрыторыі ў 500 тысяч акраў, населенай 60 тысячамі сялянскіх сем'яў, арганізован незалежны ўрад.

Карэспандэнт газеты «Аора» (выдаецца ў Гаванне), наведаўшы гэты раён, указвае, што сялянскі ўрад арганізован па прынцыпу совецкай улады. Нядаўнія спробы гаванскага ўрада падавіць сялянскі рух у Рэаленга не ўвянчаліся поспехам. Вось чаму ён вымушан быў аб'явіць перамір'е на год.

МАШЭННІЦКІЯ МАХІНАЦЫІ БЕЛАБАНДЫТА БУЛАХОВІЧА

ВАРШАВА, 30 лістапада. (БЕЛТА). Судовыя ўлады ў Варшаве заняты расследваннем машэнніцкіх махінацый былога «атамана» Булак-Балаховіча. Белагвардзейскі генерал для паляпшэння сваіх фінансаў прыбягаў да масавага продажу ордэнаў сваёй былой арміі. Ордэны розных ступеней прадаваліся сярод польскага насельніцтва. Цэны ўстанаўліваліся ў залежнасці ад сродкаў пакупніка. Ваенныя ўлады, бачачы ў «эпідэміі ордэнаў зневажанне ваенных адзнак», рашылі ліквідаваць ордэны Булак-Балаховіча. Роўналежна судовыя ўлады выявілі, што белагвардзейскі генерал не грэбаваў таксама выдачай фальшывых чэкаў.

РАЗГОН ПРОЛЕТАРСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У РУМЫНІІ

ВЕНА, 30 лістапада. (БЕЛТА). Згодна паведамлення з Румыніі, аднячасова з роспускам у Бухарэсце 32 пролетарскіх арганізацый і «Таварыства прыяцеляў СССР» сігуранца (ахранка) і ваенныя ўлады забаранілі падобныя арганізацыі ў Кішыневе, Ясах і іншых гарадах і зрабілі шматлікія арышты і вобыскі, канфіскаваўшы архівы і перапіску.

МАРСЕЛЬСКІЯ ЗАБОЙСТВЫ ПАДРЫХТОЎВАЛІСЯ У ВЕНГРЫІ

МЕМАРАНДУМ ЮГАСЛАВІІ У ЛІГУ НАЦЫЙ

ПАРЫЖ, 30 лістапада. (БЕЛТА). Югаслаўскі мемарандум, перададны Лізе нацый, прыводзіць доказы адказнасці венгерскага ўрада як за марсельскія забойствы, так і за ўсю тэрарыстычную дзейнасць югаслаўскіх эмігрантаў.

Мемарандум пачынаецца фактычнай справаздачай аб арганізацыі і падрыхтоўцы на венгерскай тэрыторыі з ведама і пры садзейнасці венгерскіх улад тэрарыстычных актаў супроць Югаславіі. Самы ранні з гэтых актаў адносіцца яшчэ к 1922 году. Венгерскія ўлады, як устанаўляе мемарандум, шырока садзейнічалі тайнаму пераходу тэрарыстаў на югаслаўскую тэрыторыю, нелегальнай дастаўцы туды зброі, адскіх машын, агітацыйнай літаратуры і т. д. Венгерскія ўлады вялі пільнае нагляданне за лагерамі тэрарыстаў, каб не дапускаць пранікнення туды ненадзейных элементаў.

Мемарандум рашуча адхіляе заяву Будапешта, што яму, нібыта, нічога не было вядома аб дзейнасці арганізацыі «Усташы» на венгерскай тэрыторыі. У мемарандуме падкрэсліваецца факт, што члены арганізацыі адкрыта насілі прадпісаную статутам форму ваеннага ўзору, што арганізацыя ў агітацыйных мэтах выпусціла сваю ўласную манету з надпісам «Незалежная харвацкая дзяржава». Мемарандум змяшчае спіс 20 палітычных замахаў, зробленых з 1929 па 1934 год югаслаўскімі эмігрантамі пры той ці іншай садзейнасці з боку венгерскіх улад.

У заключнай частцы мемарандума ўказваецца, што югаслаўскі ўрад катэгарычна адмаўляецца лічыць марсельскія забойствы ізаляваным і індывідуальным актам і разглядае іх, як частку агульнай, арганізаванай за граніцай, змовы супроць Югаславіі.

БАЯВАЯ РАШУЧАСЦЬ ПРОЛЕТАРЫЯЎ АСТУРЫІ

ПАРЫЖ, 30 лістапада. (Інфармацыя «Праўды»).

Не гледзячы на тэрор, супраціўленне працоўных Іспаніі не падаўлена. Агенцтва Гавас перадае заяву генерал-губернатара Астурыі, абвяшчаючага, што «ў народных масах яшчэ вельмі моцны рэвалюцыйны дух».

Газеты паведамляюць аб наступным характэрным для настрою рабочых у Астурыі выступленні. Рабочыя вялікага аружэйнага завода ў Трубіі выйшлі на работу ў чырвоных рубашках з вытукамі: «Няхай жыве комуністычная партыя», «Няхай жыве «Альянса обрэра» (арганізацыя адзінага фронта). Каля варот завода выступалі комуністычныя аратары.

Паліцыя раскрыла ў Овіедо тайны склад зброі, у якім знаходзілася 190 вінтовак і 36 бомб. У сувязі з гэтым арыштаваны 23 чалавекі. Усяго ў Овіедо зроблена 89 новых арыштаў. Па ўсёй Астурыі канфіскавана 349 вінтовак.

У Сен-Себасцьяне прыгавораны ў вогуле да 14 год турэмнага зняволення 8 чыгуначнікаў, якія ўдзельнічалі ва ўсеагульнай забастоўцы.

Іспанскі ўрад рашыў не адкрываць астурыйскіх шахт да таго часу, пакуль рабочыя не здадуць усю зброю. Між тым запасы вугалю ў Іспаніі вычарпаны, і яго прыходзіцца прывозіць з Англіі.

Бражэнне сярод сялян выкуслела міністра сельскай гаспадаркі ўнесці законапраект, які прадугледжвае прадастаўленне невялікіх зямельных падачак сельскагаспадарчым рабочым. Пад націскам памешчыкаў парламент унёс у гэты законапраект рад абмежаванняў. Закон пашыраецца толькі на правінцыю Эстрэмадура, дзе галеча сярод сельскагаспадарчых рабочых асабліва вялікая і дзе батракі большую частку года харчуюцца травой і кареннямі.

У ДАПАМОГУ ГАРНЯКАМ АСТУРЫІ

ПАРЫЖ, 30 лістапада. (БЕЛТА) Міжнародная рэвалюцыйнае аб'яднанне гарнякоў звярнулася да рабочых усяго свету і асабліва да шахцёраў, чыгуначнікаў і докераў з заклікам перашкодзіць дастаўцы вугалю ў Іспанію. Зварот гэты выклікан рашэннем іспанскага ўрада не аднаўляць работы на вугольных шахтах у Астурыі, каб голадам прымусіць гарнякоў адаць слананую зброю.

РОСПУСК ПРОФСАЮЗАЎ ГАРНЯКОЎ АСТУРЫІ

ПАРЫЖ, 30 лістапада. (БЕЛТА). Іспанскі ўрад распусціў усе профсаюзныя арганізацыі гарнякоў Астурыі. Роспуск матывуецца ўдзелам гарнякоў у паўстанні. Паведамляюць аб новых арыштах і катаржных прытаворах ваенна-палявых судоў. Урад прадастаўляе велізарныя сумы прамыслоўцам, пацярпеўшым страты ад паветранай і артылерыйскай бамбардыровак у часе падаўлення паўстання. Парламент зацвердзіў надзвычайныя расходы ў 10 млн. песет на пакрыццё страт астурыйскіх прадпрыемцаў.

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

◆ Французскі міністр гандлю Маршандо наладзіў сведанне ў генар прадстаўнікоў СССР у Парыжы. На сведанні прымалі ўдзел Эрыо і дырэктар дагаворнага дэпартамента міністэрства гандлю Бонефон Кралон.

◆ Над Філіпінскімі астравамі, пранёсся тайфун з хуткасцю ў 200 кілометраў у гадзіну. Тайфун прынёс велізарныя страты. Лік чалавечых ахвяр пакуль не ўстаноўлен.

◆ Дэпутатам французскай палаты ўручан тэкст праекта французскага ўрада, які патрабуе спецыяльных крэдытаў у 800 мільёнаў франкаў для надзвычайных ваенных патрэб. Пераважная частка гэтых крэдытаў —615 мільёнаў франкаў—будзе скарыстана на пакрыццё расходаў на артылерыі і на выраб зброі.

НА ДАПАМОГУ ІСПАНСКІМ РЭВОЛЮЦЫЯНЕРАМ

МЕНСК

* На адозву ЦК МОПР Іспаніі пролетарыі Менска адказваюць практычнай дапамогай іспанскім рэвалюцыянерам. На радзе заводаў і фабрык горада адбыліся шматлікія мітынгі рабочых.

Рабочыя завода імя **Молатава** і чорвонаснежнай фабрыкі **«Окцябр»** звярнуліся да ўсіх працоўных БССР з заклікам дапамагчы рэвалюцыянерам Іспаніі.

— У адказ на люты тэрор фашыстаў, — гаворыцца ў адозве рабочых фабрыкі «Окцябр»—калектыў фабрыкі **абавязваецца ў снежні адпрацаваць адзін выходны дзень у карысць іспанскаму пролетарыяту і выклікае ўсе фабрыкі і заводы БССР паследваць іх прыкладу.**

* Шматлюдны быў мітынг на заводзе імя **Варашылава.**

— Наш калектыў, — заяўлялі выступаўшыя рабочыя, — гатовы аказаць дапамогу іспанскім рэвалюцыянерам, якія гераічна змагаліся і змагаюцца за пролетарскую рэвалюцыю.

Тысячны калектыў аднагалосна прыняў прапанову **аб адлічэнні аднаго процанта месячнага акладу іспанскім пролетарыям.**

* Рабочыя **хлебазавода** вынеслі пастанову адпрацаваць на карысць іспанскіх пролетарыяў палавіну рабочага дня.

* Сто пяцьдзесят рабочых **Хімфармзавода** таксама адлічаюць паўдзённы заработак.

* Кавалі і лицейшчыкі завода **«Комукар»** аддаюць на дапамогу іспанскім рэвалюцыянерам чвэрткі рабочага дня.

* Работнікі **Беларускай Акадэміі навук** сабраліся на агульны сход для абмеркавання адозвы ЦК МОПР Іспаніі. На сходзе прысутнічала **500 чал. Тав. Шнейдэр** унёс прапанову пачаць збор сродкаў для дапамогі іспанскім рэвалюцыянерам. Навуковыя работнікі сабралі ў карысць пролетарыяў Іспаніі **3.000 руб.**

БАРЫСАЎ. На ўсіх фабрыках, заводах і ўстановах праведзены масавыя мітынгі па пытанню аб рэвалюцыйнай барацьбе іспанскага пролетарыята і дапамозе палітзняволеным.

У першы дзень, 30-га лістапада, у райком МОПР паступіла **13.000 руб. 1500** рабочых запалкавай фабрыкі «Перамога» пастанавілі адпрацаваць 1 дзень у карысць іспанскіх рабочых.

Рабочыя дрэваапрацоўчага камбіната **«Комінтэрн»** вынеслі пастанову адпрацаваць адзін дзень, што дасць **4.500 руб.** Рабочыя лесазавода імя **Молатава** ўносяць на карысць іспанскіх рэвалюцыянераў **1700 руб.** Шырокую работу разгарнулі мопраўскія ячэйкі ў калгасах. **Ячэйкі МОПР Тышчанскага сельсовета сабралі 250 руб.**

***

БАБРУЙСК. Рабочы калектыў швэйнай фабрыкі «Комінтэрн» вынес пастанову адпрацаваць на карысць іспанскіх рабочых 2 гадзіны.

***

Мы, калгаснікі калгаса **«Адраджэнне»**, Прыгараднага сельсовета, (Менскі раён) абгаварыўшы адозву іспанскай арганізацыі МОПР, **прадаем дадаткова дзяржаве 2 тоны бульбы, грошы за якую перадзім ЦК МОПР БССР для перасылкі гераічным барацьбітам, іспанскім рэволюцыянерам.**

Выклікаем паследваць нашаму прыкладу астатнія калгасы нашага Прыгараднага сельсовета.

Калгаснікі: **Р. М. Кісялёў, С. А. Канапацкі, В. У. Бесман, С. С. Якубоўскі, Я. Я. Лапкоўскі.**

***

Студэнты 5-й і 10-й груп тарфянога факультэта **Беларускага політэхнічнага інстытута,** абгаварыўшы адозву ЦК МОПР Іспаніі, уносяць на дапамогу рэволюцыйным рабочым поўдзённую стыпендыю, што складае **70 руб. 81 кап.** Выклікаем усіх студэнтаў Беларускага політэхнічнага інстытута **33 подпісы.**

Тав. Каманін наведаў пурсн, дзе прыняў удзел у злёце маладых выбаршчыкаў, упершыню выбіраючых у советы.

На здымку: Тав. Каманін (злева) і сакратар абкома ВКП(б) т. Іваноў (справа) сярод маладых выбаршчыкаў.

НА ЗЛЁЦЕ ЗОТАЎЦАЎ ЦЯЖКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР

ГОМЕЛЬ. (Ад спецкора («Звязды»).

30 лістапада злёт заслухаў садаклад сакратара Віцебскага гаркома ЛКСМБ тав. **Рагожкіна.** Тав. Рагожкін расказаў пра вопыт работы комсамола Віцебшчыны ў барацьбе за аўладанне тэхнікай. Ён гаварыў аб тэхгабінетах, аб тэхкіраўніках, аб соцтэхпраектах.

Лепшы зотавец азулярнай фабрыкі **Аскоцкі** расказаў злёту, як ён складаў сваю дыпломную работу, якія труднасці былі перад ім і як яны былі пераможаны.

Тав. Мінкоўіч паведаміў аб вялікіх дасягненнях завода імя Варашылава. Завод звыш плана дасць **на 1 мільён рублёў прадукцыі.**

На працягу дня ішлі спрэчкі. Выступалі зотаўцы, комсамольскія работнікі, тэхпрапагандысты.

***

1 снежня з раніцы прадаўжалі работу секцыі. Пасля гэтага працягваліся спрэчкі. З вялікай прамовай выступіў старшыня ЦПСБ тав. **Кавальчук.** Злёт заслухаў даклады секцый. На гэтым скончылася дзённае пасяджэнне.

Вечарам, у вялікай зале з удзелам пролетарыяў Гомеля адбылося заключнае пасяджэнне злёта. Пасля выступлення тав. **ГОТФРЫД** а таксама прадстаўніка Заходняй вобласці і прынцыпа звароту злёт закончыў сваю работу. **ГЛЕЗЕР.**

ПРЫЕЗД ФРАНЦУЗСКАЙ РАБОЧАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ У МЕНСК

Учора па запрашэнню рабочых завода імя Варашылава і фабрыкі «Окцябр» у Менску спынілася французская рабочая дэлегацыя з 13 чалавек, якая варочаецца ва Францыю з паездкі па Совецкаму Саюзу.

У складзе дэлегацыі — комуністы, сацыялісты, беспартыйныя рабочыя і сялянне. Узначальвае яе тав. **Легало,** стары рабочы металіст з 47-гадовым вытворчым стажам, сацыяліст, актыўны ўдзельнік адзінага фронта.

Французскія таварышы прысутнічалі на Окцябрскіх святах у Маскве і наведалі Ленінград, Днепрапятроўск, Днепрагрэс, Саліно і Крым.

Учора днём дэлегацыя прысутнічала на выбарчым сходзе рабочых чыгуначнага вузла ў кіно «Чырвоная зорка».

Бурнымі воплескамі сход сустрэў з'яўленне на трыбуне французскага шахцёра **Марэваля** з горада Вазье.

Тав. Марэваль сказаў:

— Мы захоплены ад усяго бачанага ў вас. За месяц прабывання ў Совецкім Саюзе мы азнаёміліся з усімі бакамі совецкага жыцця. Мы ўбачылі велізарныя поспехі, дасягнутыя вамі за XVII год дыктатуры пролетарыята. Зрэшты, каб абвяргнуць паклёп буржуазнага друку, каб яшчэ больш узмацніць адзіны фронт рабочых.

Тысячы рук падняліся, калі была агалошана прапанова арганізаваць збор сродкаў у дапамогу Іспанскім змагарам супроць фашызма.

Французская дэлегацыя ў поўным складзе далучылася да рашэння **сходу і перадала старшынствуючаму тав. Шулькіну 65 франкаў, сабраных тут-жа сярод членаў дэлегацыі ў фонд дапамогі іспанскім рэволюцыянерам.**

Учора-ж дэлегацыя пабывала ў гаспіях у рабочых фабрыкі «Комунарка» і іншых прадпрыемствах горада.

М. КІН.

НА ПРЫЁМЕ Ў тав. ЧАРВЯКОВА

Учора вечарам французская рабочая дэлегацыя была прынята старшынёй ЦВК БССР тав. **Чарвяковым.** На прыёме прысутнічалі знатныя людзі лепшыя ўдарнікі завода імя Варашылава, фабрык «Комунарка» і «Окцябр», прадстаўнікі навуковага света — акадэмік **Гаўсман,** прафесары **Мелкіх** і **Сакалоўскі** і карэспандэнты газет.

Тав. Чарвякоў вітаў французскіх рабочых ад імя рабочых, калгаснікаў і ўсіх працоўных Беларусі.

У адказным слове старшыня дэлегацыі тав. **Легало** сказаў:

— Мы прыехалі з капіталістычнага свету ў Совецкі Саюз, аб якім ведалі не так ужо многа.

Мы раскажам рабочым і сялянам Францыі, паслаўшым нас сюды, аб усім бачаным, аб грандыёзных поспехах совецкіх пролетарыяў у барацьбе за сацыялізм.

Французскія дэлегаты прыехалі ў Совецкі Саюз для таго, каб навучыцца рабіць рэволюцыю, для таго, каб ісці па шляху пракладзенаму Окцябрскай рэволюцыяй.

У гутарцы прымалі ўдзел члены дэлегацыі, прадстаўнікі менскіх фабрык і заводаў і прысутныя вучоныя.

РАСШЫРАЕЦЦА СЕТКА ХЛЕБНЫХ КРАМ

Новыя пякарні ў гарадах і раёнах

Наркамат унутранага гандлю, рыхтуючыся да разгорнутага гандлю хлебам праводзіць наступныя мерапрыемствы.

Павялічваецца магутнасць хлебазаводаў у Менску, Гомелі і Магілеве. У Менску на 30 тон у суткі, у Гомелі на 20 тон, Магілеве на 12 тон.

На даабсталяванне хлебазаводаў адпушчана 1.220.000 руб.

Расшыраецца вытворчая база па хлебапячэнню і ў раёнах. Па лініі спажывецкай сістэмы, выпечка хлеба будзе павялічана на 100 тон у суткі. Пякарні ОРС'аў Наркамлеса павялічваюць выпечку хлеба на 28 тон у суткі, пякарні Торфпромсаюза на 20 тон.

У Слуцку, Крычаве, Лагойску і іншых раёнах будуюцца новыя хлебапякарні. Праводзіцца рэканструкцыя амаль усіх хлебапякарань па БССР. Гэта павялічыць іх магутнасць на 1.450 тон у суткі.

Павелічэнне магутнасці хлебапякарань патрабуе і расшырэння гандлёвай сеткі. Дадаткова адкрываецца 337 пунктаў па гандлю хлебам. З 1 студзеня 1935 года па БССР будуць функцыянаваць 1.143 пункты па продажу хлеба, з іх 497 на вёсцы і 647 у горадзе. Арганізуюцца таксама 24 узорна-паказальныя магазіны. З іх 14 па лініі дзяржгандлю і 10 па лініі спажывецкай сістэмы. На абсталяванне хлебных магазінаў па сістэме БКС адпушчана 200000 руб.

Наркамгандаль павінен атрымаць у першым квартале 1935 г. каля 35 грузавых аўтамашын і расшырыць конны парк на 100 адзінак.

ЦІ ГАТОВЫ МЕНСКІЯ ЭНЕРГАГАСПАДАРКІ ДА ЗІМЫ?

Па гэтаму пытанню «Звязда» і Менгарком КП(б)Б склікаюць нараду кіраўнікоў Менскай ЦЭЦ, электрастанцый і прадпрыемстваў.

На нараду павінны з'явіцца дырэктары, галоўныя і дзяжурныя інжынеры, машыністы турбін і старэйшыя качэгары ЦЭЦ і электрастанцый, дырэктары наступных прадпрыемстваў: з-да імя Варашылава, «Комунар», «Большэвік», імя Мясникова, «Окцябр» Ланцугоў Галля, імя Молатава, імя Кагановіча, ф-кі імя 8-га сакавіка, «Комунарка», «Беларусь», «Ударнік», імя Крупскай, і «Пролетарый». Выклікаюцца дырэктары: энергатрэста—т. Ардачнікаў, Навукова-даследчага інстытута—т. Слонім, загадчык энергасектара інстытута т. Хайтовіч і навуковы спецыяліст інстытута т. Цепяровіч.

Нарада абмяркуе пытанні:

1. Гатоўнасць энергагаспадарак да зімы.
2. Эканомія электраэнергіі і апалу.

Нарада адбудзецца 4 снежня у 7 г. вечара у памяшканні редакцыі «Звязда» (III паверх, промаддзел).

«Звязда», Менгарком КП(б)Б.

Адк. рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

Рэпертуар БДТ—I
Белдзяржтэатр Вогары і Балета
тел. 24505
Мастацкі кіраўнік—засл. артыст рэспублікі Р. ГІТГАРЦ.
Назначаны на сёння, 2-X I—34 г. спектакль для ГК Прафсаюзы
„СЕВІЛЬСКІ ЦЫРУЛЬНІК"
АДМЯНЯЕЦЦА.

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка"
Гукавы мастацкі фільм
ЧАПАЕЎ
Звыш праграмы—КАНЦЭРТ

Гукавы кіно-тэатр „Пролетарый"
Гукавы мастацкі фільм
ЧАПАЕЎ

Дырэкцыя і калектыў работнікаў Музея Рэволюцыі з глыбокім жалем паведамляюць аб заучасной смерці дырэктара Музея
т. КУШНЯРОВА Міхаіла Пракопавіча,
паследваўшай 1 снежня 1934 года ў 9 гадзін раніцы.
Вынас цела з памяшкання Музея Рэволюцыі (вул. Урыцкага, 4а) для пахавання адбудзецца 2 снежня ў 3 гадз. дня

Дырэкцыя, партком і калектыў работнікаў інстытута гісторыі партыі выказваюць глыбокі жаль з прычыны заучасной смерці навуковага супрацоўніка інстытута і дырэктара Музея Рэволюцыі БССР
тав. КУШНЯРОВА Міхаіла Пракопавіча.

Кіно „Інтэрнацыянал" НОВАЯ ПРАГРАМА

Кіно „Спартак" Новы замежны фільм За гонар брата

АДКРЫТ ПРЫЁМ ПАДПІСКІ на 1935 год
„ТЕАТР и ДРАМАТУРГИЯ"
штомесячны грамадска-навукова-мастацкі журнал тэатра, драматургіі і крытыкі, орган Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР.
„ТЕАТР и ДРАМАТУРГИЯ" разлічан на работнікаў сцэны, драматургіі і літаратуры і на навучаючыхся ў тэатразах.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: 12 мес. 72 р., 6 мес.—36 руб., 3 мес.—18 руб.
„АРХИТЕКТУРА СССР"
штомесячны журнал, орган Саюза совецкіх архітэктораў.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: 12 мес.—72 р., 6 мес.—36 р., 3 мес.—18 р.
„СОВЕТСКОЕ ИСКУССТВО"
орган Наркамасветы.
Шасцідзённая газета па пытаннях тэатра, музыкі, эстрадных і вытворчых мастацтваў і кінематаграфіі.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: 12 мес. — 12 руб., 6 мес.—6 р., 3 мес.—3 р.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: Москва 6, Страстной бульвар 11, „Жургазоб'яднанне", інструктарамі і ўпаўнаважанымі Жургаза, усюды поштай (аддзяленнямі Саюздрука).
„ЖУРГАЗОБ'ЕДИНЕНИЕ".

ГАРАДСКАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ
даводзіць да ведама ўсіх прафарганізацый, ЖАКТаў і ўсіх арганізацый, што
ПОЗВЫ НА СХОДЫ ПА ВЫБАРАХ У СОВЕТ
выдаюцца на ўсе выбарчыя участкі да 10 снежня ўключна.
Позвы выдаюцца штодзённа ад 9 гадзін раніцы да 11 гадзін вечара, у памяшканні Горсовета, пакой 32 (II паверх).
Гарадская выбарчая камісія.

НА ПАДСТАВЕ ПАСТАНОВЫ ЎРАДА
БЕЛКОМУНБАНК
праводзіць суцэльны ўчот усяго соц культ. бытавога будаўніцтва па становішчу на 1-XII—34 г.
Усе забудоўшчыкі як па новаму будаўніцтву, так і па рамонту і будаўніцтву, зданаму ў эксплаатацыю, АБАВЯЗАНЫ прадставіць у Белкомунбанк справаздачнасць па форме № 13-а за лістапад НЕ ПАЗНЕЙ 10-XII г.г.
Забудоўшчыкі, бухгалтары і планавікі, не прадставіўшыя справаздачнасць к устаноўленаму тэрміну, будуць аштрафаваны і прыцягнуты да адказнасці.
БЕЛКОМУНБАНК.

АДКРЫТ ПРЫЁМ ПАДПІСКІ на 1935 год
„ОГОНЁК"
самы распаўсюджаны ў СССР штотыднёвы масавы ілюстраваны журнал.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: 12 мес. 7—р. 20 к., 6 мес.—3 р. 60 к., 3 мес.—1 руб. 80 кап.
ЖИЗНЬ „ЗАМЕЧАТЕЛЬНЫХ ЛЮДЕЙ"
3-я СЕРЫЯ БІЯГРАФІЙ
Клара Цэткін, Эдысон, Кох, Лермантаў, Леанардо да Вінчы, Нерасаў, Фоад, Парацэльз, Жорэс, Галілей, Сезанн, Белінскі, Капернік, Дарвін, Камісаржэўская, Шыллер, Мальер, Шамель, Клаўзевіц, Бланкі, Тонас Мюнцэр, Гліінка, Сен-Сімон, Наполеон і інш.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: 12 мес. (24 кн.)—25 р. 20 к., 6 мес. (12 кн.)—12 руб 60 к., 3 мес. (6 кн.)—6 р 30 кап.
„БИБЛИОТЕКА ОГОНЕК"
друкуе творы лепшых совецкіх і замежных пісьменнікаў, а так сама творы сусветных класікаў —72 кнігі ў год.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: 12 мес.—(72 кн.)—12 р., 6 мес. (36 кн.)—6 р., 3 мес. (18 кн.)—3 руб.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: Москва, 6, Страстной бульвар, 11, „Жургазоб'яднанне", інструктарамі і ўпаўнаважанымі Жургаза, усюды поштай і аддзяленнямі Саюздрука.
ЖУРГАЗОБ'ЕДИНЕНИЕ.

МЕНСКІ ГІДРАТЭХНІКУМ
паведамляе студэнтам, што заняткі на ўсіх курсах пачаліся з 1 снежня г.г.
К паказанаму тэрміну з'явіцца без спазнення па адрасу: Менск, Пляц Волі, д. № 4.
Дырэктар Гідратэхнікума ТУКАНСКІ.

Кіраўніцтва мастацтва Наркомасветы БССР
4 СНЕЖНЯ г. г. у 11 гадзін раніцы
СКЛІКАЕ
НАРАДУ ДЫРЭКТАРОЎ ТЭАТРАЎ І МАСТАЦКІХ КІРАЎНІКОЎ
па пытаннях:
1. Каштарысы і планы на 1935 год.
2. Справаздачы БДТ-III і БДТ-I аб удзеле ў выбарчай кампаніі ў советы.

БЮРО ГАЗЕТНЫХ ВЫРАЗАК
даведачна-інфармацыйнай канторы Бел. Кіраўніцтва сувязі
АДКРЫТА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТНЫЯ ВЫРАЗКІ на 1935 год
Газетныя выразкі даюць самую поўную, самую жывую, самую дакладную інфармацыю па ўсіх пытаннях, якія асвятляюцца на старонках друку.
Бюро газетных выразак мае для задавалення заказаў усе цэнтральныя, абласныя і краявыя газеты СССР і ўсе мясцовыя газеты БССР—усяго да 500 назваў газет.
Заказы на газетныя выразкі дасылайце па адрасу: Даведачна-інфармацыйнай канторы—г. Менск, Ленінская, 28.
Упаўнаважанага для прыёму падпіскі выклікайце па тэлефону 05 і 23-359.

ЦБ секцыі навуковых работнікаў БССР з глыбокім жалем паведамляе аб заучасной смерці члена секцыі
тав. КУШНЯРОВА Міхаіла Пракопавіча.

Менск, друкарня «Звязда» Выпускаючы — А. КРУЧКОЎ, вт. дырэктара — БЯРОЗАВІК, вт. галоўнага — ПЕРАЧЛАДНЕЎ, вт. эканамічнага — КАГАН, вт. ручнога — АНУЧЫК.
Уп. Галоўлітбела № К—6369.